Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

САКАВІК 15 1933 г.

№ 58 (4602)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АБ МЕРАХ, ЯКІЯ ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЬ ПАСКАРЭНЬНЕ ТЭМПАЎ РАМОНТУ ТРАКТАРАЎ — Пастанова бюро ЦК КП(б)Б (3 стар.).

ПРА КАНТРАКТАЦЫЮ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ УРАДЖАЮ 1933 г. — Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б (3 стар.).

АБ ПЕРАЗАКЛЮЧЭНЬНІ КАЛДАГАВАРОЎ НА 1933 г. — Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ, Наркамцяжпраму, Наркамлёгпраму, Наркамлесу, Наркамсобу, Упаўн. НК саўгасаў (3 стар.).

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Выканаць плян кантрактацыі ільну і канапель. ЯРАСЛАЎСКІ — Маркс, Энгельс і рэвалюцыйны рух у Расіі (2 стар.).

ЗА МЯЖОЮ:

Вынікі выбараў у органы камунальнага самакіраўніцтва (4 стар.).

Арышты камуністаў ня спыняюцца (4 стар.).

Упартыя бае за праход Сыфінкоу (4 стар.).

31 мільён на марскія ўзбраеньні (4 стар.).

БЕРАЖЭЦЕ, ЯК ВОКА, НАСЕНФОНДЫ!

Выканаць плян кантрактацыі ільну і канапель

БССР — адзін з рашалочых ільнаводчых раёнаў Савецкага саюзу. Дзесяткі тысяч тон сырцу дае кожны год наша рэспубліка для пэкстыльнай прамысловасьці краіны.

У сьвятле гэтага набывае выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б «Аб кантрактацыі ільну і канапель ураджаю 1933 г.», якая публікуецца сёньня ў «Зьвязьдзе».

Кантрактацыя — першае і важнейшае звяно зігатоўчай кампаніі. Практыка мінулых гадоў паказала, што іменна ад посьпеху кантрактацыі залежыць у значнай ступені своечасовае і поўнае выкананьне плану загатовак. Вось чаму партыйныя і савецкія арганізацыі БССР абавязаны пабальшэвіцку ажыцьцявіць пастанову СНК і ЦК, правесьці кантрактацыйную кампанію сапраўды па-бальшавіцку.

СНК і ЦК вызначылі кантрольнае заданьне па кантрактацыі ільну ў 28.900 тон, пяньку — 2.600 тон, ільнасена — 23.000 тон, канаплянага — 1.500 тон. Гэта заданьне павінна быць выкананае **СВАЯЧАСОВА І ПОЎНАСЬЦЮ.** Што для гэтага трэба?

Па-першае, неабходна, як гэтага патрабуюць СНК і ЦК, разгарнуць кантрактацыю **НЕАДКЛАДНА.** Трэба ўлічваць памылкі мінулага году, калі ў радзе раёнаў і сельсаветаў работа па кантрактацыі пачыналася са значным спазьненьнем, калі дагаворы заключаліся перад пачаткам, а то і ў самы пэрыяд загатовак.

Зараз-жа, не чакаючы ні аднаго дня, пачаць заключэньне кантрактацыйных дагавораў — вось першая і неабходная ўмова посьпеху кампаніі.

Па-другое, трэба павесьці гэту работу бадзёрыя, ударныя тэмпамі, з тым, каб **скончыць яе да 25 красавіка** — тэрміну, вызначанага пастановай СНК і ЦК. Ні ў якім разе не дапусьціць зацяжкі кантрактацыі, ні ў якім разе не парушыць тэрміну сканчэньня яе!

Пята сушэньня, што кулак і яго агентура будуць шалёна супраціўляцца кантрактацыі, прыкладуць усе сілы для зрыву гэтай работы. Яны бязумоўна паспрабуюць арганізаваць такі-як сабатаж, як і ў загатоўчай кампаніі, яны паспрабуюць прыцягнуць на свой бок калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, з'агітаваць іх супроць заключэньня дагавораў з дзяржавай.

Па-бальшавіцку змагацца з кулацкім сабатажам, капчаткова разгромім яго, мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на барацьбу з клясавым ворагам і яго агентамі, за ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў партыі і ўраду — просты абавязак рэйённых арганізацый, сельсаветаў і парт'ячэек у правядзеньні кантрактацыйнай кампаніі. Трэба разгарнуць шырокую масава-палітычную работу ў калгасах і вёсках, фактуемачыць кожнаму калгасьніку і працоўнаму аднаасобніку сутнасьць кантрактацыі, выгады ад продажу прадукцыі дзяржаве, ільготы, якія даюцца пасеўшчыкам і кантрактантам ільну і канапель і г. д.

Дзяржава стымулюе пасеў і здачу ільну радам ільгот. 18.250 тон збожжа будзе выдана адначыкам ільну, з іх 3.000 тон адпускаюцца кантрактантам звісной у часе сяўбы і прадолжі.

Калгасы і аднаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, якія сеюць лён і канопілі, атрымліваюць ільготы праз вызваленьне гэтых пасеваў ад сельска - гаспадарчага падатку, бясплатнае акладное страхаваньне ад засухі і інш.

Баявая задача раённых арганізацый, загатоўчых сыстэм і сельсаветаў — **ВЫКАРЫСТАЦЬ УСЕ ГЭТЫЯ ІЛЬГОТЫ ДЛЯ МАКСЫМАЛЬНАГА ФАРСАВАНЬНЯ КАНТРАКТАЦЫІ, ДЛЯ ПАСЬЛЯХОВАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ЗАГАТОВАК.** Трэба забясьпечыць прафільнае выкарыстаньне гэтых фондаў для стымуляваньня, рашуча ажыцьцяўляючы дырэктыву ЦК і СНК аб тым, што «**збожжа, якое атрымліваецца калгасамі ў парадку стымуляваньня пасеву, і загатоўкі ільну і пяньку, разьмяркоўваецца выключна паміж калгасьнікамі, якія фактычна працавалі па пасеве, праполцы і апрацоўцы ільну і канапель**». Збожжа пасеўшчыкам і здатчыкам ільну і канапель павінна адпускацца ў **простай залежнасьці ад якасьці** здаванай прадукцыі.

Сыстэмы Белканторы Загатільну і Белкаапсаюзу — непасрэдныя правадзікі кантрактацыі—дагаворы павінна працаваць дрэнна, абломаўскімі, чэрапашчынымі тэмпамі. Лепш за ўсё ад гэтых сьведчаць даныя пра ход ільназагатовак і дзяржаўных закупак збожжа. Гэтыя арганізацыі абавязаны [illegible]-жа перабудаваць сваю работу, [illegible] апараты ад чужых, антыкулацкіх элемэнтаў, дабіцца жывога, [illegible] ацыйнага кіраўніцтва [illegible] нізоўкай. Толькі тады Белкантора Загатільну і Белкаапсаюз здолеюць ажыцьцявіць усклаўдзеную на іх баявую задачу па кантрактацыі.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б вызначылі рад канкрэтных і практычных мерапрыемстваў для пасьпяховага правядзеньня сяўбы ільну і канапель. У бягучым годзе павінна быць засеяна пад лён ня менш 260 тыс. га, а пад канопілі — 30 тыс. га.

За гэтыя кантрольныя лічбы павінна змагацца кожная партарганізацыя, кожны камуніст, кожны добрасумленны калгасьнік і аднаасобнік.

Асабліва вялікая адказнасьць усклаўдзецца на партарганізацыі ільнаводчых раёнаў. Яны павінны ні на хвіліну не забываць, што іменна **ільнаводчыя раёны вырашаюць посьпех барацьбы за лён,** і што па выніках правядзеньня кантрактацыі сяўбы і загатовак тэхнічных культур у ільнаводчых раёнах партыя будзе **меркаваць аб баяздольнасьці тэй** ці іншай арганізацыі, таго ці іншага камуніста. Яны павінны поўнасьцю ажыцьцявіць мерапрыемствы, вызначаныя партыяй і ўрадам для павышэньня ўраджайнасьці і паляпшэньня якасьці ільну, у прыватнасьці, «**забясьпечыць з вясны 1933 году пераход ільнаводчых калгасаў на правільны севазварот, скарыстоўваючы наяўнае па БССР насеньне канюшыны для забесьпячэньня гэтых калгасаў**». (З пастановы СНК і ЦК).

Але мала засеяць лён, яго трэба **своячасова і поўнасьцю ўбраць і апрацаваць.** Ні для каго не сакрэт, што адной з прычын зацяжкі ільназагатовак у радзе раёнаў і сельсаветаў зьяўляецца тое, што лён ня быў своячасова ўбран, што яго апрацавалі з вялікім спазьненьнем, а мясцамі ён і дагэтуль ляжыць неапрацаваным.

Ні ў якім разе гэтага нельга дапусьціць у бягучым годзе. СНК і ЦК прапанавалі Наркамзему БССР, райвыканкомам і райкомам КП(б)Б скопчыць да 1 жніўня 1933 г. поўны рамонт усіх мачыльных ям, сушнаў, сушыльна-мяльных і трапальных пунктаў; да 1 верасьня г. г. павінны быць пабудаваны ў калгасах 34 мачыльныя ямы для ільну, 20 буйных мачыльных ям для пяньку, 150 палепшаных сушылак з тамяніканьнямі для мяцьця і трапаньня ільну. Белільнатрактарацэнтр і Белсельгасслаб абавязаны забясьпечыць завод у асноўныя ільнаводчыя раёны шыроказахватных ільнацерабілак, ільнаачысьцілёў, ільнатрыераў, ільняных і канапляных малатарань і пасьлідпрадвальных мялак для ільну і пяньку.

Белтансімбуду і Белтрактарацэнтру прапанавана забясьпечыць неабходнымі сродкамі і абсталяваньнем будаўніцтва ільназаводаў з такім разьлікам, каб да 1 верасьня 1933 г. скончыць гэта будаўніцтва. З 1 красьніка 1933 г. па БССР павінна працаваць ня менш 70 ільназаводаў.

Усе гэтыя мерапрыемствы, вызначаныя ЦК КП(б)Б і СНК БССР, павінны быць поўнасьцю ажыцьцёўлены. Гэта вырашыць посьпех уборкі і своячасовай апрацоўкі ільну.

Кантрактацыя ільну і канапель будзе мець рэальнае значэньне толькі тады, калі загатоўчыя сыстэмы, раённыя арганізацыі паладзяць **контроль за выкананьнем** кантрактацыйных дагавораў, калі яны дабіваюцца поўнага ажыцьцяўленьня абавязацельстваў перад дзяржавай **кожным калгасам, кожнай аднаасобнай гаспадаркай,** якая заключыла дагавор.

Пралетарская дзяржава аказвае валізарную дапамогу калгасам і працоўным аднаасобным гаспадаркам насеньнем, машынамі, упрасьненьнем, крэдытамі і г. д. Дзяржава кожны год укладае ў разьвіцьцё сельскай гаспадаркі мільярды рублёў. Гэта дае права дзяржаве патрабаваць ад калгасаў і аднаасобных гаспадарак акуратнага і поўнага выкананьня сваіх абавязкаў перад ёю. Кантрактацыйны дагавор — гэта вексэль, які выдае дзяржаве калгас, аднаасобная гаспадарка на здачу таварнай прадукцыі. Гэты вексэль павінен быць поўнасьцю аплочан. Таму СНК і ЦК абавязалі мясцовыя савецкія і партыйныя органы вёсьці самую жорсткую барацьбу з недобрасумленнымі кантрактантамі, якія ашуканваюць дзяржаву з мэтай атрымаць збожжа, насеньне і іншыя ільготы, шляхам фіктыўнай кантрактацыі; несвячасовай апрацоўкі, псаваньня ільну і канапель, у выніку дрэннага расьцілу або мочкі і г. д. Да недобрасумленных кантрактантаў павінны быць укаты жорсткія меры спачнаньня. Нельга спыняцца перад жорсткімі рэпрэсіямі да тых, якія злосна зрываюць выкананьне сваіх абавязацельстваў, прынятых кантрактацыйнымі дагаворамі.

Кантрактацыю ільну і канапель ураджаю 1933 г. — партарганізацыі БССР павінна правесьці па-баявому, улічыўшы **вопыт і памылкі мінулых гадоў.**

У БАБРУЙСКІМ, БУДА-КАШАЛЕЎСКІМ, ЧАВУСКІМ І ЗАСЛАЎСКІМ РАЁНАХ НЕ ЗМАГАЮЦЦА З РАСКРАДВАНЬНЕМ НАСЕНЬНЯ

ЧЫСТКА ПА-ЧАВУСКУ

Некалькі сігналаў, якія яркa характарызуюць наколькі дрэнна, злачынна дрэнна рыхтуецца **Чавуская** МТС да сяўбы.

Па калгасах МТС яшчэ ня ссыпана насеньне: збожжавых — амаль 600 цэнтнэраў, ільну — 190 і бульбы — 4.000.

Гэта справа кулацкіх рук. У цэлым радзе калгасаў насеньне разбазарана. У калгасе «Чырвоны ўсход» насеньне ня ссыпана, а ўвесь ураджай ужо разьмяркован. Гэту кулацкую справу правёў старшыня калгасу **Вараб'ёў.**

Праўленьне калгасу «Новае жыцьцё» выдала такія аванасы, што не засталося ні аднаго кілё для насенфондаў.

Ці ведае дырэкцыя МТС аб гэтых агідненьких фактах? Ня толькі ведае, але і прымае, так сказаць, поўныя меры. Толькі якія?

Ачыстку калгасаў ад кулацка-шкодніцкіх элемэнтаў у раёне праводзяць па-свойму, па-чавуску... Да самага апошняга часу на чале калгасу «Новае жыцьцё» стаяў кулак **Зомэр.** Раней ён меў 30 дзесяцін зямлі ды эксплёатаваў батракоў. Гэты кулак арганізаваў масавае раскрадваньне калгаснай маемасьці.

Зомэра цяпер з пасады старшыні, праўда, зьнялі, але... кулака-шкодніка пакінулі ў калгасе. І па сёньняшні дзень Зомэр знаходзіцца ў с.-г. арцелі «Новае жыцьцё».

Хто пралез у гэты калгас?

Назавем, апроч Зомэра, толькі найбольш характэрных.

А. Раманоўскі — сын кулака, які меў 100 дзесяцін зямлі. Уся сям'я Раманоўскага высланa, а сам ён чаўгухітрыўся прабрацца ў члены партыі і, прыкрываючыся партбілетам, вёў заядлую антысавецкую работу.

Ф. Касянкоў — кулак. Раскулачан пры калектывізацыі.

М. Баргулін — кулак.

Адсюль і адпаведныя вынікі. У калгасе згноєна да 170 цэнтнэраў бульбы. Разбазарваецца калгасная маемасьць. Украдзены два кані. Злачынцы дагэтуль не пакараны.

Цяпер у калгасе праведзена чыстка. Кіраваў правядзеньнем чысткі камуніст Русанкоў (які між іншым, сваяк... кулака Раманоўскага). І ён пастараўся... Амаль усё кулацкае ахвосьце, што разбурала калгас, пасьля чысткі засталося ў калгасе. І па сёньняшні дзень членамі калгасу зьяўляюцца кулакі Касянкоў, Баргулін ды іншыя.

Так, МТС, з дазволу сказаць, дапамагае калгасам ачысьціцца ад кулацка-шкодных элемэнтаў. Ясна, у чым справа. Людзі страцілі клясавую пільнасьць.

Цяпер аб становішчы ў самой МТС. Зноў падамо толькі некалькі лічбаў, якія гавораць самі за сябе.

Трэба адрамантаваць 11 трактараў. Гатовы толькі тры. Трэба вывезьці 26.220 вазоў гною. Вывезена толькі 338. Штучнае ўгнаеньне ўвесь час валялася пад адкосам і цяпер патлёла.

Аб кадрах. У гэтым годзе трэба падрыхтаваць 80 трактарыстаў. На курсах, аднак, вучыцца толькі 47. Хто яны? Дырэкцыя ня ведае. На курсы прымалі каго хочаце, бяз усякага разбору і праверкі. У выніку ў трактарысты пралезьлі кулацкія элемэнты.

Курсы ільнацерабільшчыкаў наогул яшчэ не пачыналі свае работы, хоць тэрмін пачатку вучобы — 1 сакавіка — мінуў.

Прозьвішча дырэктара МТС—**РАВІС.** Дакуль **райком КП(б)Б** будзе толькі наглядальнікам фактаў? **С.**

А РАЙКОМ МАЎЧЫЦЬ...

ЗАСЛАЎЕ, 13. Калгас «13 гадзіньня Каспрычніка» буйнейшы ў раёне. Ён яднае 300 гаспадарак С.-Гарадзецкага сельсавету.

Калгас зусім ня рыхтуецца да сяўбы. Насеньне аўса, вікі, гароху і іншых культур зусім ня ссыпана. З 90 плугоў адрамантавана толькі 7. Калёсы і драбны разьбіты і не рамантуюцца.

Каптасам кіруе шкодніцкая зграя на чале з кулаком Павідайкай. Павідайка ў мінулым кулак. У часе белапольскай акупацыі ён займаў пасаду жандара. Гэты кулак сыстэматычна раскрадвае калгаснае дабро. Напрыклад, Павідайка для сваіх уласных патрэб набраў 80 пудоў жыта і прысвоіў прамтавары, адпушчаныя для прамяваньня калгасьнікаў-ударнікаў.

Каб замесьці сьляды злачынстваў, Павідайка на пасаду рахункавода паставіў свайго роднага брата. На пасаду ключніка-фуражыра Павідайка прыняў былога кулака Карэюка, які да ўступленьня ў калгас быў абкладзен індывідуальным падаткам. На пасаду калявода пралез былы кулак Жукоўскі, які меў малатарню і іншыя складаныя машыны.

Увосень 1932 году калгас павінен быў засеяць 350 га жыта, фактычна засеялі толькі 240. Жукоўскі-ж дае весткі ў райза аб тым, што плян выканан поўнасьцю. Сяўба была праведзена яўна па-шкодніцку. Замест 10-12 пудоў на гэктар высявалі па 6-7. Рэшту збожжа Жукоўскі раскраў і разбазарыў.

Кулакі пралезьлі і на стайню. Коньох Павідайка Язэп былы цьвёрдазаданьнік, але яму ўсё можна, бо ён сваяк старшыні калгасу. З 134 коняй больш 90 вывезены са строю. Да такога становішча іх давялі конюхі Павідайка, Талочка і Матусэвіч. Падзеж коняй—амаль штодзённая зьява. Кулак Новадворскі ўжо загнаў некалькі коняй, але яго ніхто не прыцягнуў да адказнасьці.

Кулацкая зграя давяла гаспадарку буйнейшага ў раёне калгасу да поўнага развалу.

Аб гэтым ведае сакратар партыйнай ячэйкі Карповіч, ведае загадчык райза, ведае і раённы камітэт партыі. Ня могуць ня ведаць, бо раённая газэта «Камунар Заслаўшчыны» ўжо ня раз сыгналізавала пра становішча калгасу.

Але райком чамусьці маўчыць і ніякіх мер **ня прымае.** **Ф.**

АШУКАНЦЫ З СЛУЦКАГА РАЙЗА

Аб севазваротах у Слуцку гавораць давольні. Шумікі і бясконцых гутарак—колькі хочаце. А вось справы, сапраўднай практычнай справы—ні на грош.

У пачатку лютага райземаддзел склікаў канфэрэнцыю старшынь сельсаветаў і калгасаў з удзелам пільнаў даў. На канфэрэнцыі спэцыяльна стаяла пытаньне аб севазваротах.

Але ўсё гэта было зроблена толькі для адводу вачэй. Райземаддзел да канфэрэнцыі зусім не падрыхтаваўся. Гаварылася тут аб усім і наогул, а вось аб тым, як увесьці севазвароты —ні слова.

Гэта,зразумела, выклікала справядлівае абурэньне ўдзельнікаў канфэрэнцыі. Яны рашуча заявілі:

— Што вы нас сабралі, каб сказаць пра значэньне севазваротаў. Гэта мы добра ведаем і так. Вы нам лепш практычна, на справе дапамажэце правільна ўвесьці севазвароты ў кожным калгасе.

З таго часу прайшло больш за 45 дзён. Але справа не пасунулася ні на крок. Райземаддзел пальцам не паварушыў, каб нават разаслаць калгасам тыповыя севазвароты.

Праўда, у некаторых калгасах райземаддзел прабаваў сёе-тое зрабіць. Напрыклад, па даручэньні райземаддзелу ў калгас «Новая справа» прыбыў каморнік **ЭПШТЭЙН,** каб увесьці севазварот.

Што-ж, вы думаеце, ён зрабіў? Эпштэйн прыехаў, узяў кавалак паперы і мэханічна разьбіў плошчу калгасу на пяць роўных палёў. Аказваецца, гэта і ёсьць... увядзеньне севазвароту. Эпштэйн нават не пацікавіўся, што з сабе ўяўляе калгас, яго палі, яго вытворчая база.

Гэты гора-каморнік толькі, паўтараем, намалёваў пешта на кавалку паперы і адразу заявіў:

— Гані 76 руб. за ўвядзеньне севазвароту.

— Ну, як-жа за гэта плаціць — заяўляе старшыня калгасу тав. Рачкоўскі,—калі чалавек нават ня выйшаў на поле, нават не запытаўся, дзе і што наш калгас сеяў.

Так гастралёр — ашуканец Эпштэйн уводзіць, з дазволу сказаць, севазвароты ня толькі ў калгасе «Новая справа». У калгасе «Сядзіна» ён прарабіў **тое-ж самае. І ў выніку пад пахаць былі ўключаны...** зарыўныя сенажаці.

Слуцкі райземаддзел наогул бюракратычна, па-чыноўніцку адносіцца да калгасаў. Падамо адзін яркі і надзвычай характэрны факт. Вось ужо цэлы год, як райземаддзел мяняе спэцыялізацыю калгасу «Новая справа». То даецца адзін напрамак—садова-гародны, то жывёлагадоўчы і так без канца.

6 сакавіка ў райземаддзел прыехаў старшыня калгасу «Новая справа» тав. Рачкоўскі. Ён, нарэшце, паставіў пытаньне, што называецца, рубам:

— Спынеце сваю гульню ў спэцыялізацыю, дайце раз і назаўсёды цьвёрды напрамак нашаму калгасу, дапамажэце распрацаваць вытворчы плян.

Што-ж вы думаеце адказаў намесьнік гэтага загадчыка райземаддзелу т. **ДАШКОЎ.**

— Напрамак, кажаш, вытворчы плян!.. Ды кінь лепш думаць аб высокіх матэрыях...

Каментары да гэтага адказу сапраўды непатрэбны. **М. С.**

ДЫРЭКТЫВЫ ПРЫМАЛІ, ДЫРЭКТЫВЫ ПАСЫЛАЛІ...

Б.-КАШАЛЕЎСКАЯ (Наш. кар.).

10 гадзін раніцы. У райвыканкоме пуста і ціха. На сьцяне адзінока вісіць загад старшыні РВК тав. Стрэйкіса аб тым, каб усе сутрацоўнікі прыходзілі на работу да 9 гадзін. Загад хоць і грозны, але на яго проста ніхто не зварачае ўвагі.

Нарэшце, стрэлка падпаўзае да 11. Канцылярыя і габінэты райвыканкому паволі запаўняюцца людзьмі. Адным словам, работнікам райвыканкому жывецца спакойна і мірна. Тое-ж самае ў райземаддзеле—цішыня, мёртвы спакой...

У раёне панує ўпэўненасьць, што з падрыхтоўкай да сяўбы ўсё, так сказаць, добра. Адкуль такая ўпэўненасьць? Справа ў тым, што раённая МТС скончила рамонт трактараў. Гэта і закружыла галовы раённым работнікам. Людзі як захлыпаюцца ад радасьці: вось мы якія, першымі трактары адрамантавалі...

А пра каня, пра насеньне і пасеўныя пляны ў раёне проста забылі. Прыкрываюцца сабе посьпехамі МТС, а самі нічога ня робяць!

Факты—упартая рэч. І яны з усёй сілай сьцвярджаюць, што раён да сяўбы бы рыхтуецца яусім дрэнна.

І па сёньня пасеўныя пляны да калгасаў не даведзены. Пашуе поўная блытаніна. Планы мяняюцца як надвор'е. Сёньня—адны, заўтра—ужо зусім іншы, і так без канца. Тры разы мянялі райземаддзел плян сяўбы яравых для калгасаў. Мяняе і цяпер —у чацьверты і, паводле заявы загадчыка райземаддзелу т. Завацкага, апошні раз.

На гэты апошні раз людзі асабліва пастараліся. Завацкі адным махам скарацілі пасеўны плян для калгаснага сэктару на 300 га збожжавых.

Ссыпка насенных фондаў—пад пагрозай. Калгасы Забалоцкага сельсавету, напрыклад, ссыпалі насеньня ўсяго толькі ў памеры 26 проц. Та кое-ж, прыкладна, становішча і па калгасах іншых сельсаветаў.

Ахова ссыпкнага насеньня зусім не наладжана. Ніхто за насенфонды фактычна не нясе ніякай адказнасьці. Ні райком партыі, ні РВК, ні райземаддзел ня ўжылі ніякіх мер, каб суровa пакараць кулацкоў-шкодніцкаў і іх агентаў, якія сьвядома псуюць ссыпанае насеньне.

Фактаў такога шкодніцтва можна надаць давольні. У калгасе «Перамога» ссыпалі насеньне ў сёмры недагледжаны сьвіран. Амаль 12 цэнтнэраў ямчмяно прарасло і згніло. У калгасах «Пралетары» і «Ударнік» насенфонды жвалены сьнегам. Значная частка насеньня згніла. Таксама злачынна адносяцца да насенных фондаў і ў калгасе «Новае жыцьцё». Плян ссыпкі насенфондаў па бульбе выканан толькі на 50 проц. Аднак, і тое, што ссыпана зусім не ахоўваецца. Па калгасах раёну зноса да 20 проц. ссыпанага насеньня бульбы.

Што-ж вы думаеце робяць раённыя арганізацыі? Як яны змагаюцца з кулацкім шкодніцтвам? Ім не да гэтага. Яны толькі ганарліва казырэюць лічбамі... калгаснага прыліву.

Загадчык райземаддзелу Завацкі ва ўвесь голас крычыць, што ўсё добра, што ў раёне ідзе масавы прыліў у калгасы.

У райземаддзеле ганаранца лічбамі прыліву, але ня маюць, літаральна, ніякага ўяўленьня, каго прымаюць у калгасы.

Вельмі шмат прынятых у калгасы гаспадарак, якія не здалі ні аднаго грама насеньня. Насеньне разбазарана. У некаторых калгасы пралезьлі кулацка-шкодніцкія элемэнты, якія арганізавалі масавае раскрадваньне калгаснай маемасьці. Даволі ўказаць, што толькі ў адзін калгас «Перадавік» пралезла 8 кулацкіх гас падарак.

Задаем пытаньне сакратару РК КП(б)Б т. **Сморчанка:**

— Якія меры ўжыў райком, каб забясьпечыць своячасовае правядзеньне сяўбы?

Адказ:

— А хто іх прыпомніць. Гэтым мер надзвычай шмат...

А іменна:

— Прымалі дырэктывы, пасылалі дырэктывы, праводзілі пасяджэньні...

— Даводзілі планы сяўбы да калгасаў праз (слухайце, слухайце!!!) канфэрэнцыі раённага актыву.

І г. д., і г. д.

Адным словам, сядзяць людзі ў канцылярыях, скрыпяць пер'ямі, псуюць паперу і нічога ня бачаць, што робіцца пад іх-жа носам.

Н. Г.

Вал. Мядзьведзеў

Буда-кашалеўск ія барабаншчыкі

НА ВАЧОХ БАБРУЙСКІХ ГАСТРАЛЁРАЎ

«Наіўна думаць, што насеньне ляжыць гатовеньнім у сьвірнах, неабходна зараз-жа разгарнуць барацьбу за зварот у насенны фонд раскрадзенага, незакон на разданага збожжа» (Постышаў).

Вось аб гэтым І забылі ў Бабруйскім раёне.

Да пачатку сакавіка ў раённых арганізацыях, асабліва ў райземаддзеле, панавалі благадушныя настроі. Лічылі, што плян ссыпкі насенфондаў па калгасах нават ПЕРАВЫКАНАН. Асабліва ўзмацніліся гэтыя настроі пасьля таго, як райземаддзел правёў у канцы лютага праверку насенфондаў і сабраў ад праўленьняў калгасаў захавальныя расьпіскі.

Партыйны актыў, які выяжджаў у пэрыяд з 5 па 12 студзеня на вёску для стварэньня насенфондаў, таксама быў дэмабілізован. Работнікі, якія пасылаліся на вёску, ня былі непасрэдна прымацаваны да калгасаў.

Лютаўскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б завастрыў увагу ўсіх арганізацый на неабходнасьці рашуча ўзьняць пільнасьць у справе стварэньня і захаваньня насенных фондаў. Гэта выклікала ў раёне некаторы зрух.

27 лютага райком партыі і РВК накіравалі ў калгасы 83 работнікі (а калгасаў у раёне 136) для праверкі становішча са ссыпкай і захаваньнем насенных фондаў.

Гэта праверка праходзіла 10 дзён Якія-ж яна прынесла рэзультаты?

Праверка праводзілася фармальна, па вяхоўна, абыяк. Даволі ўказаць, што ў раёне ні разу не пераважылі наяўнага насеньня, не праверылі яго якасьці. Значная частка ўпаўнаважаных РК і РВК, хоць і езьдзілі па калгасах, хоць і сядзелі ў калгасах, падпісвалі розныя паперы, праводзілі розныя пасяджэньні, але наяўнасьці і якасьці насенных фондаў так і НЕ праверылі.

Адказны работнік райземаддзелу Азарэц, напрыклад, ухітрыўся за адзін дзень аб'езьдзіць... 7 калгасаў Грабацьвіцкага сельсавету і «праверыць» ва ўсіх гэтых калгасах наяўнасьць і якасьць насенфондаў. За гэты-ж час Азарэц пасьпеў скласьці і ўзяць ад праўленьняў калгасаў 7 захавальных расьпісак, НЯ ўзважыўшы ні аднаго кілё насеньня. Між тым, іменна ў калгасах гэтага сельсавету, больш чым дзе-небудзь, мелі месца факты раскрадваньня і разбазарваньня калгаснага насеньня, факты простага шкодніцтва з боку кулацкіх элемэнтаў, пралезшых у калгасы.

У тых калгасах, дзе працавалі на гастралёры, а добрасумленныя таварышы, праверка выкрыла зусім іншы малюнак, чым гэта паказалася ў зводках райземаддзелу. Так, штампоўшчыкі з райземаддзелу да апошняга часу лічылі, што насенныя фонды па збожжавых культурах ссыпаны на 104,1 проц. Праверка прынесла новую лічбу — 97,3 проц. Але і гэта лічба яшчэ не адлюстроўвае сапраўднага становішча ў калгасах з тэй прычыны, што ў зводку ўключана колькасьць насеньня ад гаспадарак, якія нядаўна ўступілі ў калгасы, а іх зямля ў пасеўным пляне ня ўлічана.

Такім чынам, нават і на сёньняшні дзень у раёне НЯ ведаюць як стаіць справа ў калгасах з насеннымі фондамі.

Кулацка-шкодніцкія, антысавецкія элемэнты, за сьпіной бабруйскіх «шляп» з партбілетамі ў кішэні, выкарысталі гэта становішча для сваёй контр-рэвалюцыйнай падрыўной работы. Больш чым у 15 калгасах устаноўлены ўжо факты адкрытага раскрадваньня, разбазарваньня і псаваньня калгаснага насеньня.

У калгас імя Якаўлева пралезьлі кулацкія, антысавецкія элемэнты, утаілі значную колькасьць насеньня, каб яго разбазарыць і гэтым самым сарваць сяўбу.

Рахункавод калгасу Чайко ўвесь час ашукваў даверлівыя раённыя арганізацыі. У той час, калі ў калгасе ёсьць пішак ячменю ў 18 цэнтн., Чайко паказвае ў зводках, што ў калгасе не хапае 1,6 цэнтн. ячменю.

Ахову насенных фондаў у гэтым калгасе захапілі ў свае рукі кулацкія элемэнты. У тройку па запрыходваньні збожжа ўваходзяць: кладаўшчык калгасу, сын раскулачанага, Курыпчык, заможнік Бацюк і кулак Янка Чыслаў. Ня дзіва, што ў калгасе насеньне крапі, хто толькі мог. Ад 44 цэнтнэраў насеннага аўса, напрыклад, засталося толькі 13.7.

Насеньне разбазаравалі на вачох старшыні калгасу Бандарэнкі, упаўнаважанага РК і РВК Эпштэйна і брыгадзіра Мухіна, адказнага за праверку насеньня ў калгасе. Гэты Мухін за 10 дзён знаходжаньня ў калгасе праводзіў бясконцыя пасяджэньні, сходы, чытаў вялізныя даклады, але... забыў пра дробязь — не праверыў наяўнасьці насенфондаў.

Панскія, бюракратычныя мэтады работы і клясавая сьлепата гэтых «упаўнаважаных» далі магчымасьць кулаку бесьперашкодна праводзіць сваю контр-рэвалюцыйную справу.

У калгасе «Прамень камуны» загадчык гаспадаркі Абрамчык, кладаўшчык Лугаў (кулак) укралі ўвесь насенны авёс. Кулак Лугаў не запрыходваў 1.927 кілё збожжа, каб потым яго раскрасьці. У конюха Крамко знойдзена ў стайні 900 кілё ячменю.

У калгасе «Перамога» калгасная маемасьць разбазарваецца направа і налева. Насеньне не ачышчана і знаходзіцца ў разбураным сьвірне. Інвэнтар валяецца пад сьнегам. Калгасам кіруе былы фэльд фэбэль Аўсяньнікаў.

Старшыня калгасу «Камуна» — Жданькова дала падпіску, што калгас поўнасьцю забясьпечан насеньнем. А ў калгасе разбазараны 2 тоны аўса.

У калгасе «Перамога», Рымавіцкага сельсавету, старшыня Гарбель разам з загадчыкам гаспадаркі (кулаком) і рахункаводам (сынам, раскулачанага) разбазарылі некалькі цэнтнэраў яравой пшаніцы, раскралі капец насеннай бульбы і г. д. Для таго, каб утаіць сьляды сваіх злачынстваў, яны, пры ўдзеле ўпаўнаважанага РК КП(б)Б, склалі акт аб неўраджаі. У гэтым-жа калгасе кулакі пакралі ўсе канцэнтраваныя карма. Ніхто са зладзеяў НЯ прыцягнут да судовай адказнасьці.

А вось якой у сьвятле гэтых фактаў была пільнасьць РК КП(б)Б і РВК. Упаўнаважаны Ігур не пераважыў ні аднаго кілё насеньня, каб на справе пра верыць наяўнасьць насенных фондаў і іх якасьць. Упаўнаважаны РК Камар праверыў у калгасе «Чырвоны партызан» насенфонды паводле... запісаў у кнізе кладаўшчыка.

Такіх фактаў шмат. Яны яркa паказваюць, што фармальны і бездушны гастралёрскі падыход упаўнаважаных РК і РВК да такой сур'ёзнай, як праверка насенфондаў, выкарысталі клясавыя ворагі на сваю карысьць.

Характэрна адзначыць, што за апошні месяц пракурор разьследуе і накіраваў у суд 280 спраў. Аднак, сярод гэтых спраў няма ні адной аб разбазараваньні насеньня ў калгасах. І гэта ня гледзячы на тое, што 10 сакавіка РК і РКК ухвалілі спэцыяльную пастанову аб аддачы пад суд за разбазараваньне насенных фондаў.

На гэтай пастанове варта спыніцца. РК і РКК КП(б)Б у сваёй пастанове не называюць ні аднаго прозьвішча ўпаўнаважанага, старшыні калгасу і г. д., вінаватых у згаданым разбазараваньні збожжа. Аддаюцца суду ня людзі, не канкрэтныя носьбіты зла, а... калгасы наогул. У кантрольную камісію перададзены не канкрэтныя вінаватыя, а ўпаўнаважаныя наогул. Шукай, адным словам, ветру ў полі.

Поўную палітычную сьлепату ў гэтым пытаньні праявіў раённы камітэт ЛКСМБ. Да 10 сакавіка райком нават ня ведаў аб фактах разбазараваньня насенных фондаў у калгасах.

***

Факты злачыннага разбазараваньня насенных фондаў у Бабруйскім раёне павінны ўзварушыць ня толькі бабруйскую арганізацыю.

Усе раёны БССР абавязаны неадкладна на праверыць наяўнасьць і якасьць насенных фондаў у калгасах. Трэба ачысьціць калгасы ад кулака, які шкодніча іменна сарваць сяўбу шляхам разбазараваньня і раскрадваньня насеньня. Трэба рашуча ўзмацніць пільнасьць кожнай арганізацыі, кожнага камуніста, пакончыўшы з панска-бюракратычнымі адносінамі да такой важнейшай справы, як барацьба за насеньне!

Разбазаранае і незаконна разданае збожжа — назад, у насенныя фонды калгасаў! **Т. Р.**

„ГЕНІЯЛЬНАСЬЦЬ МАРКСА ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, ШТО ЁН ЗДОЛЕЎ РАНЕЙ ЗА ЎСІХ ЗРАБІЦЬ... І ПРАВЕСЬЦІ ПАСЬЛЯДОЎНА ТОЙ ВЫВАД, ЯКОМУ ВУЧЫЦЬ СУСЬВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ. ГЭТЫ ВЫВАД ЁСЬЦЬ ВУЧЭНЬНЕ АБ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЕ“ *(ЛЕНІН).*

З ПАДРЫХТОЎЧЫХ РАБОТ ДА „ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ ВА ФРАНЦЫІ“ К. МАРКСА

Ніжэй публікуецца ў перакладзе з ангельскай мовы ўрывак з падрыхтоўчых работ Маркса да «Грамадзянскай вайны ва Францыі».

У архіве інстытуту Маркса-Энгельса-Леніна хаваюцца аргіналы двух першых варыянтаў гэтай працы. Як вядома, «Грамадзянская вайна ва Францыі» была апублікавана ў якасьці маніфэсту 1-га Інтэрнацыяналу; з прычыны гэтага Маркс быў прымушан значна скараціць свае першапачатковыя нататкі.

Даны ўрывак узяты з больш раньняга варыянту і публікуецца ў першы раз.

Падрыхтоўчыя працы Маркса да будуць у поўным відзе апублікаваны ў «Грамадзянскай вайны ва Францыі», «ахове Маркса і Энгельса». Інстытут Маркса-Энгельса-Леніна.

***

Нянавісьць французкага селяніна скапцэнтравана на аграрыі, на ўласьніку маёмкту, на людзях мільярдай кампэнсацыі, 1) і на гарадзкім капіталісце, пераапранутым у земельнага ўласьніка, уварваньне якога ў сялянскае жыцьцё ніколі ня ідзе так хутка, як пры другой імпэрыі; 2) часткова жыўленая штучнымі дзяржаўнымі мерамі, частковa натуральна вырастаючая з самога разьвіцьця сучаснай сельскай гаспадаркі. Аграры ведаюць, што тры месяцы панаваньня рэспублікі ва Францыі зьявіліся сыгналам да паўстаньня сялянства і сельскага пралетарыяту супроць іх.

1. Гутарка ідзе аб кампэнсацыі ў мільярд франкаў, якія былі выплачаны за кошт французкіх сялян, што вярнуліся з эміграцыі, памешчыкам у перыяд рэстаўрацыі пасьля 1814 г. —Рэд.

2. Другая імпэрыя—імпэрыя Напалеона (1851—1870 г.)—Рэд.

Вось адкуль іх лютая нянавісьць да Камуны. Вызваленьня сялян яны баяцца яшчэ больш, чым нават вызваленьня гарадзкога пралетарыяту. Сяляне вельмі хутка абвясьцілі-б гарадзкі пралетарыят сваім кіраўніком і галавой. Праўда, ва Францыі, як і ў большасьці капітыэнтальных краін, існуе глыбокі антаганізм паміж гарадзкімі і сельскімі вытворцамі, паміж прамысловым пралетарыятам і сялянствам. Імкненьнем пралетарыяту, матар'яльнай асновай яго руху зьяўляецца арганізаваная ў вялікім маштабе праца, хоць цяпер яна арганізавана дэспатычна ў цэнтралізацыі сродкаў вытворчасьці, хоць яны пакуль яшчэ цэнтралізаваны ў руках манапаліста, ня толькі як сродкі вытворчасьці, але і як сродкі эксплёатацыі і падчыненьня вытворцы. Задача пралетарыяту заключаецца ў тым, каб вывесьці сучасныя капіталістычны характар гэтай арганізаванай працы і гэтых цэнтралізаваных сродкаў працы, ператварыць іх са сродкаў клясавага паняволеньня і клясавай эксплёатацыі ў формы свабоднай асацыяванай працы і грамадзкіх сродкаў вытворчасьці.

З другога боку, праца селяніна разьдзелена і яго сродкі вытворчасьці раздроблены, распылены. На гэтых эканамічных рознасьцях надбудована цэлы сьвет розных сацыяльных і палітычных поглядаў. Але гэта сялянская ўласнасьць даўно ўжо пакінула зваротную парамальную фазу, г. зн. тую фазу, калі яна была рэальнасьцю; была спосабам вытворчасьці і формай уласнасьці, якія адпавядалі эканамічным патрэбнасьцям грамадзтва і ставілі са міх сельскіх вытворцаў у нармальныя ўмовы жыцьця. Пэрыяд яе заняпаду зацягнуўся. З аднаго боку, з яе вышаў шматлікі сельскі пралетарыят, інтарэсы якога супадаюць з інтарэсамі гарадзкіх наёмных рабочых. Самы спосаб вытворчасьці пастараў, з прычыны павейшых посьпехаў аграмаміі. Нарэшце, сама ўласнасьць стала цяпер намінальнай, замяняючы селяніну ілюзіі ўласнасьці і арабляючы ў яго шёны яго ўласнай працы. Канкурэнцыя буйнай фэрмерскай вытворчасьці, падатак крыві—дзяржаўны падатак, ліхварскія процанты па закладных і абкрадваньне яго на розныя лады судовай сыстэмай, якая яго аблытвае—зьвялі селяніна на ступень індыйскага райёта *) і ў той-жа час яго экспрапрыяцыя—нават экспрапрыяцыя яго намінальнай уласнасьці—і зьвядзеньне яго ў становішча сельскага пралетара адбываецца штодзённа. Значыцца, селяніна адзяляе цяпер ад пралетара ўжо не рэальны інтарэс, а толькі апошнячы забабон. Калі Камуна, як мы паказалі, зьяўляецца адзінай уладай, якая можа яму неадкладна даць вялікія пазыкі нават пры яе цяперашнім эканамічным становішчы, дык яна-ж ёсьць адзіная форма кіраваньня, якая можа забясьпечыць селяніну зьмену яго сучаснага эканамічнага становішча, выратаваць яго ад экспрыяцыі памешчыкам, з аднаго боку, ад катаржнай работы і галечы, дзеля мнімай уласнасьці—з другога, можа ператварыць яго намінальную ўласьць на зямлю ў рэальную ўласнасьць на плёны яго працы, можа абярэгуць яму на карысьць выгады ад уласнай аграмаміі, выклікаванай да жыцьця грамадзкімі патрэбнасьцямі, але цяпер штодзённа выступаючай.

Супроць яго, як варожая сіла—можа зрабіць усё гэта—ня зьнішчаючы яго становішча, як сапраўды незалежнага вытворцы. Атрымаўшы непасрэдныя выгады ад рэспублікі Камуны, ён хутка прасякнуўся-б давер'ем да яе.

*) Райёт—індыйскі селянін, закабалены непамернымі паборамі.—Рэд.

Ем. Яраслаўскі

Маркс, Энгельс і рэвалюцыйны рух у Расіі

В перапісцы Маркса і Энгельса, з літаратурных твораў, якія адносяцца да раньняй пары іх рэвалюцыйнай дзейнасьці, можна бачыць, які вялікі інтарэс праявілі творцы навуковага сацыялізму да «расійскіх спраў».

У маі 1851 г. Энгельс пісаў Марксу аб Польшчы і Расіі і выказваў упэўненасьць, што «рэвалюцыя адбудзецца ў Расіі значна хутчэй, чым у Польшчы». «Што такое,—пытае Энгельс,—Варшава і Краков у параўнаньні з Пецярбургам, Масквой, Адэсай і г. д. і г. д.?»[1]).

У студзені 1860 г. Маркс у лісьце да Энгельса пісаў: «Па маёй думцы, самыя найвялікшыя падзеі ў сьвеце ў сучасны момант—гэта, з аднаго боку амэрыканскі рух рабоў, які пачаўся пасьля сьмерці (Джона) Брауна, з другога—рух рабоў у Расіі. Ты, зразумела, заўважыў, што дваранство ў Расіі аддарта занялося агітацыяй за канстытуцыю і што 2-3 чалавекі з самых выдатных сем'яў ужо сасланы ў Сібір. У той-жа час Александар пашаў сякае адносіны і з сялянамі, абвясьціўшы ў сваім знакомім маніфэсце літаральна, «што камуністычны прынцып» павінен зьнікнуць з вызваленьнем. Так пачаўся «сацыяльны рух» на Захадзе і Усходзе. Разам з надыходзячым крахам у Цэнтральнай Эўропе гэта будзе грандыёзна[2]).

26 студзеня 1860 г. Энгельс паведамляе Марксу: «У Расіі, таксама па-шчасьце, сцвавы ўскладняюцца. У «Аўгсбурскай газэце» ёсьць зараз вельмі добры карэспандэнт у Пецярбургу. Праўда, ён зварачае ўвагу больш на канстытуцыйны рух дваранства, але ён, зразумела, дасьць штуршок сялянам[3]».

Сотні лістоў Маркса прысьвечаны абмену думкамі аб прачытаных ім кнігах Фляроўскага, Чарнышэўскага, Герцэна і інш. Яго барацьба з Бакуніным і бакуністамі і з Герценам пры вяла яго ў самае цеснае сутыкненьне з групамі расійскіх рэвалюцыянэраў, якія таксама не падзялялі поглядаў Бакуніна і Герцэна.

Маркс перапісваўся з Бакуніным і Уцінным, Герценам, Лапаціным, Міколай—он'ам, Фляроўскім—Борві, Вера Засуліч, Лаўровым і цэлым радам іншых выдатных рускіх рэвалюцыянэраў свайго часу. За вывучэньне расійскай мовы Маркс узяўся ў 1869 г.—ён працаваў тады над II-м томам «Капіталу»—у сувязі з атрыманьнем кнігі Борві-Фляроўскага «Становішча рабочай клясы ў Расіі». У пашы гэтага году Маркс у лісьце да Кугельмана паведамляе, што ён пачаў вывучаць расійскую мову з прычыны таго, што «мне прыслалі з Пецярбургу кнігу аб становішчы рабочых клясаў, зрозумела, уключаючы сюды і сялян у Расіі». [4]).

Марксам кіравала пры гэтым таксама жаданьне знаёміцца з сапраўднымі літаратурнымі творамі Герцэна і асабліва Чарнышэўскага. Праз тры месяцы пасьля пачатку заняткаў Маркс ужо чытаў па-расійску кнігу Герцэна «Тюрьма и ссылка».

Рэвалюцыйныя народнікі адносіліся да Маркса з вялізарнай павагай. Гэта відаць хаця-б з таго, што яны даручылі імянна Марксу ад іх імя прымаць удзел у Міжнародным Таварыстве Рабочых. 24 сакавіка 1870 г. Маркс паведамляў Энгельсу аб лісьце ад рускай калёніі ў Жэнэве, якая паслала яму прапанову быць прадстаўніком ад рускай секцыі ў генэральным савеце: «Мы не прынялі, — пішэ ён Энгельсу,—я прыняў яе пра панову ўвайсьці яе прадстаўніком у Генэральны Савет, таксама паслаў ім кароткае ў адказ паведамленьне (афіцыяльнае), разам з ім і прыватны ліст аб дазволе апублікаваць яго ў іх часопісі. Пацешнае становішча для мяне—выступаць у якасьці прадстаўніка маладой Расіі. Чалавек ніколі ня ведае, да чаго ён можа дайсьці і ў якой дурной кампаніі можа апавацца. У афіцыяльным адказе я хвалю Фляроўскага і падкрэсьліваю, што галоўная задача расійскай секцыі—пра цаваць у нарысьць Польшчы, г. зн. вызваліць Эўропу ад іх уласнага суседзтва. Я палічыў больш правільным ні адным словам не ўспамінаць пра Бакуніна ні ў афіцыяльным, ні ў канфідэнцыяльным лісьце. Але чаго я ніколі не падарую малайцом — гэта таго, што яны ператварылі мяне ў «паважанага», яны, як відаць, думаюць, што мне ад 80 да 100 год». [5]).

Перапіска Маркса і Энгельса з пов'язку рускіх спраў асабліва ўсю суму пытаньняў рускай рэвалюцыі. Тут і пытаньні тэорыі, і крытыка утапічнага сацыялізму народнікаў, і барацьба супроць пан-славізму і славянафільства Герцэна, Бакуніна і інш., супроць тэорый і практыкі Бакуніна і Нячаева, тут і крытыка поглядаў Ткачова і выкрыцьцё эклектызму П. Л. Лаўрова. Можна сказаць, што Маркс і Энгельс у крытыцы поглядаў рэвалюцыйнага народніцтва зрабілі ня менш, чым рускія сацыял-дэмакраты ў 80-90 г. г. і ў больш позьнія гады, калі ўжо разгарнуўся рабочы рух.

Маркс і Энгельс далі кірунак гэтай крытыцы, яны паставілі ў сваёй перапісцы ўсе асноўныя пытаньні і праблемы рускай рэвалюцыі. Мы пакідаем тут у баку параўнальна добра вывучаную гісторыю барацьбы Маркса супроць бакунізму, барацьбы, якая мела такое вялікае значэньне для лёсу І Інтэрнацыяналу. Вялізарную цікавасьць для ўсьвяленьня поглядаў Маркса на рэвалюцыйнае народніцтва прадстаўляюць адносіны яго да Міхаіла Гаўрылавіча Чарнышэўскага.

М. Г. Чарнышэўскі—адна з самых яркіх фігур у руху рэвалюцыйнага народніцтва. Калі Чарнышэўскі ўступіў на арэну палітычнай барацьбы, сялянства яшчэ ня было дыферэнцыявана. Рэвалюцыйны дэмакрат Чарнышэўскі заявіў сябе ворагам не толькі царскага самаўладзтва і памешчыкаў, але і ворагам усёй рускай буржуазіі,—у тым ліку і самай лібэральнай,—ён з запалам выступіў на абарону народнай масы, якая жорстка эксплёатавалася і памешчыкам, і капіталістам, і скупшчыкам, і спекулянтам, і кулаком і чыноўнікам.

Гарадзкая рабочая маса была ў той час яшчэ вельмі незначнай. Як самастойная кляса, пралетарыят ледзьледзь пачаў выступаць. Будучы сацыялістам-утапістам, Чарнышэўскі марыў таксама як і многія іншыя рэвалюцыйныя народнікі аб некапіталістычным шляху разьвіцьця Расіі.

Як вядома, Чарнышэўскі быў адным з улюбёных пісьменьнікаў Леніна ў той перыяд, калі складваўся яго сьветапогляд. У дасягнах артыкулаў можна знайсьці выказы Леніна да Чарнышэўскага, водгукі, поўныя найтлыбейшай павагі да гэтага бацькі рэвалюцыйнага народніцтва. Таксама адносіўся да Чарнышэўскага і Маркс.

Аб гэтым мы можам меркаваць па заяве Г. Лапаціна, які, будучы арыштаваны 2(14) лютага 1871 г. у Томску, пісаў генэрал-губарнатару І. Сінельнікаву:

«У часе знаходжаньня майго ў Лёндане я сыпоўся там з нейкім Карлам Марксам, адным з найбольш выдатнейшых пісьменьнікаў у галіне палітычнай эканоміі і адным з найбольш роснастайна адукаваных людзей у цэлай Эўропе. Гадоў пяць таму назад гэты чалавек надумаўся вывучыць рускую мову. Вывучыўшы рускую мову, ён выпадкова натрапіў на заўвагі Чарнышэўскага да вядомага трактату Мілля і на некаторыя іншыя артыкулы таго-ж аўтара. Прачытаўшы гэтыя артыкулы, Маркс адчуў глыбокую павагу да Чарнышэўскага. Ён ня раз гаварыў мне, што з усіх сучасных эканамістаў Чарнышэўскі прадстаўляе адзінага сапраўды арыгінальнага мысьляцела, між тым, як іншыя—толькі простыя кампілятары, што яго творы поўны арыгінальнасьці, сілы і глыбіні мысьлі і што яны прадстаўляюць адзіныя з сучасных твораў па гэтай навуцы, якія запрэдуды заслугоўваюць прачытаньня і вывучэньня, што рускія павінны саромецца таго, што ні адзін з іх не паклапаціўся да гэтага часу пазнаёміць Эўропу з такім выдатным мысьліцелем, што палітычная сьмерць Чарнышэўскага ёсьць страта для вучонага сьвету ня толькі Расіі, але і цэлай Эўропы і г. д. і г. д.» [6]).

У гэтай сувязі асабліва цікава вялізарная перапіска Маркса з Міхаілам—он'ам («Летописи марксизма», кніга II-я, ГИЗ 1930 г., стар. 34) наконт спробы вызваленьня Чарнышэўскага. У гэтай перапісцы некалькі раз упамінаецца «наш прыяцель»—Лапацін, якому была даручана справа вызваленьня Чарнышэўскага з Вілюйскай ссылкі. Ужываючы канспірацыю, якая, на наш погляд, здаецца даволі празрыстай, Маркс пісаў Міхаілу—он'у 13-VII-1891 г.: «Наш прыяцель» павінен вярнуцца ў Лёндан са сваёй гандлёвай паездкі. Кароспандэнты тэй фірмы, па даручэньні якой ён разьязджае, пішуць мне часамі з Швэйцарыі і з іншых месц. Уся справа рухне, калі ён адкладзе свой зварот і сам ён павінен спрацаваць магчымасьць аказаць далейшыя паслугі сваёй фірме, суперніку фірмы паведамлены аб ім, шукаюць яго і наўпрыдзе заменяць яго ў якую-небудзь пастку сваімі падкопамі» [7]).

12-VII-1872 г. Маркс пісаў: «Мне хацелася-б напрыкладзь што-небудзь аб жыцьці і дзейнасьці Чарнышэўскага, каб выклікаць спачуваньне да яго ў Заходняй Эўропе, але для гэтага мне патрэбны фактычныя даныя». З гэтага-ж ліста відаць, што яму быў прысланы рукапіс «Письма без адреса» Чарнышэўскага і што Уцін зьбіраўся яе надрукаваць.

Надзвычай цікавы перапіска Маркса і Энгельса з Лаўровым. Лісты да Лаўрова, апублікаваныя ў «Летописи марксизма», адносяцца да 70-х, пачатку 80-х гадоў. Яны сьведчаць аб тым, што Лаўроў на ўсім працягу гэтых гадоў заставаўся ў самай цеснай сувязі з асноваполажнікамі навуковага сацыялізму, што Лаўроў дапамагаў выпуску «Капіталу», што Маркс і Энгельс рабілі вялізарны ўплыў на П. Л. Лаўрова, і што пад гэтым непасрэдным уплывам Маркса напісана ад яго з выдатных работ П. Л. Лаўрова аб Парыжскай Камуне.

Перапіска Маркса з Верай Засуліч прысьвечана пытаньню аб магчымасьці некапіталістычнага шляху разьвіцьця Расіі.

Мы маглі-б значна памножыць матар'ял, які сьведчыць аб самай цеснай сувязі Маркса і Энгельса з выдатнейшымі дзеячамі рускага рэвалюцыйнага руху таго часу. Часамі ў гэтай перапісцы і ў літаратурных творах Маркса і Энгельса гучаць розныя ноты, у асабліва́сьці ў адносінах да бакуністаў, да Герцэна, Нячаева, Элпідзіна, Ткачова і асабліва да панславістаў.

Маркс і Энгельс усёй сваёй дзейнасьцю, усёй сваімі сувязямі з рэвалюцыйным народніцтвам паказалі, што яны зьявіліся адзінымі людзьмі ў міжнародным рабочым руху, якія правільна зразумелі ролю рэвалюцыйнага народніцтва, яго месца ў гісторыі рэвалюцыйнага руху. Іх адносіны да рэвалюцыйнага народніцтва ніколі ня былі адносінамі старонніх пагляд дальнікаў, «спачуваючых» рэвалюцыйнаму руху ў Расіі. Маркс і Энгельс былі актыўнымі памочнікамі, па-свойму ўдзельнікамі яго. Найвялікшыя рэвалюцыянэры і мысьліцелі свайго часу, яны не маглі застацца толькі гледачамі народнай барацьбы жменькі рэвалюцыянэраў з царскім самаўладзтвам. Усёй сваёй істотай былі яны на баку гэтага руху. Яны палажылі выгадную пачатку на пакаленьні рускіх рэвалюцыянэраў, якія выхоўваліся на такіх геніяльных творах, як «Камуністычны маніфэст», як «Капітал». Адсталасьць грамадзкіх адносін, слабасьць пралетарыяту ў Расіі таго часу перашкаджалі рэвалюцыйным народнікам зразумець, што вучэньне Маркса можа быць прыкладзена ня толькі да перадавых краін капіталізму (як думалі многія рэвалюцыйныя народнікі), але што яно зьяўляецца адзіным вучэньнем, здольным і ў Расіі вывесьці рэвалюцыю на правільны шлях.

[1]) К. Маркс і Ф. Энгельс, т. XXI, стар. 211.

[2]) К. Маркс і Ф. Энгельс, т. XXII, стар. 474.

[3]) К. Маркс і Ф. Энгельс, т. XXII, стар. 475-476.

[4]) К. Маркс. Лісты да Кугельмана, ДВГ 1928 г., стар. 67.

[5]) К. Маркс і Ф. Энгельс, т. XXIV, стар. 309-310.

[6]) «Летописи марксизма» кн-т К. Маркса і Ф. Энгельса, кн. V «ГИЗ» 1928 г. Лісты К. Маркса і Ф. Энгельса да П. Л. Лаўрова, стар. 19.

[7]) «Летописи марксизма» II-XII стар. 38.

„Марксызм-ленінізм быў і ёсьць тое кіраўніцтва да пераможнага дзеяньня, якое зрабіла партыю бальшавікоў пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна непераможнай, паказала ёй шлях, загартавала яе, дазволіла перамагаць усе труднасьці, браць мацнейшыя крэпасьці“

(З адозвы Камінтэрну з п„оваду 50-цігодзьдзя з дня сьмерці Карла Маркса)

КАРЛ МАРКС

Біяграфія, напісаная Ў. І. Леніным

Карл Маркс нарадзіўся 5 мая (новага стылю) 1818 г. у горадзе Трыры (Прырэйнская Прусія). Бацька яго быў адвакат, яўрэй, які ў 1824 г. прыняў пратэстанства. Сям'я была заможная, культурная, але не рэвалюцыйная. Скончыўшы гімназію ў Трыры, Маркс паступіў ва ўнівэрсытэт, спачатку ў Бонна, потым у Бэрліне, вывучаў юрыдычныя навукі, але больш за ўсё гісторыю і філёзофію. Скончыў курс у 1841 г., напісаўшы дысэртацыю аб філёзофіі Эпікура. Па сваіх поглядах Маркс быў яшчэ тады гегельянцам-ідэалістам. У Бэрліне ён прымыкаў да гуртка «левых гегельянцаў» (Бруно, Баўэр і інш.), якія імкнуліся рабіць з філёзофіі Гегеля атэістычныя і рэвалюцыйныя вывады.

Па сканчэньні унівэрсытэту Маркс пераехаў у Бон, разьлічваючы стаць прафэсарам. Але рэакцыйная палітыка ўраду, які ў 1832 г. пазбавіў катэдры Людвіга Фэйербаха і ў 1836 г. зноў адмовіўся пусьціць яго ва ўнівэрсытэт, а ў 1841 г. адабраў права чытаць лекцыі ў Боне ў мападога прафэсара Бруно Баўэра, прымусіла Маркса адмовіцца ад вучонай кар'еры. Разьвіцьцё поглядаў «левага гегельянства» ў Германіі ішло ў гэты час уперад вельмі шпарка. Людвіг Фэйербах, асабліва з 1836 г., пачынае крытыкаваць тэапэгію і паварочваць да матэрыялізму, які зусім бярэ верх у яго ў 1841 г. («Сутнасьць хрысьціянства»); у 1843 г. выйшлі яго-ж «АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭНЬНІ ФІЛЁЗОФІ БУДУЧАГА». «Трэба было перажыць вызваленчае дзеяньне гэтых кніг»,—пісаў Энгельс потым аб гэтых творах Фэйербаха. «Мы» (г. зн. «левыя гегельянцы», Маркс у тым ліку) «сталі адразу фэйербахаўцамі». У гэты час рэйнскія радыкальныя буржуа, якія мелі сувязь з «левымі гегельянцамі» за снавалі ў Кельне апазыцыйную газэту —«Рэйнскую газэту» (пачала выходзіць з 1 студзеня 1842 г.). Маркс і Бруно Баўэр былі запрошаны ў якасьці галоўных супрацоўнікаў, а ў кастрычніку 1842 г. Маркс зрабіўся галоўным рэдактарам і пераехаў з Бона ў Кельн. Рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак газэты пры рэдактарстве Маркса станавіўся ўсё больш поўным і ўрад спачатку падпаракдаваў газэту падвойнай і патройнай цэнзуры, а потым парашыў зусім закрыць яе 1 студзеня 1843 г. Марксу прышлося да гэтага тэрміну пакінуць рэдактарства, але яго адыход усё-ж ня выратаваў газэты, і яна была закрыта ў сакавіку 1843 г. З найбольш буйных артыкулаў Маркса ў «РЭЙНСКАЙ ГАЗЭЦЕ» Энгельс адзначае, апрача ўказаных ніжэй, яшчэ артыкул аб становішчы сялянвінаробаў у даліне Маэзэля, Газэтная работа паказала Марксу, што ён мала знаёмы з палітычнай эканоміяй, і ён стаўна ўзяўся за яе вывучэньне.

У 1843 г. Маркс ажаніўся ў Крэйцнаху з Джэні фон-Вэстфален, сяброўцы маленства, з якою ён быў заручан яшчэ будучы студэнтам. Жонка яго належала да прускай рэакцыйнай дваранскай сям'і. Яе старэйшы брат быў міністрам унутраных спраў у Прусіі ў та душылі Маркса і яго сям'ю; толькі адну з самых рэакцыйных эпох, 1850 і 1858 гадоў. Увосень 1843 году Маркс прыехаў у Парыж, каб выдаваць за границай разам з Арнольдам Ругэ рады кальную часопісь. Выйшла толькі першая кніжка гэтай часопісі «Нямецка-французкі штогодзік». Ён спыніўся з-за труднасьцей патаемнага распаўсюджаньня ў Германіі і разгалосьсю з Ругэ. У сваіх артыкулах у гэтай часопісі Маркс выступае ўжо як рэвалюцыянэр, які агапашае «бязьлітасную крытыку ўсяго існуючага», апялюючы ДА МАС І ДА ПРАЛЕТАРЫЯТУ.

У верасьні 1844 году ў Парыж прыехаў на некалькі дзён Фрыдрых Энгельс, які стаў з таго часу бліжэйшым прыяцелем Маркса. Яны ўдвох прынялі самы гарачы ўдзел у тагачасным кіпучым жыцьці рэвалюцыйных груп Парыжу (асабліва значэньне мела вучэньне Прудона, з якім Маркс рашуча разьлічыўся ў сваёй «Нищете философии», 1847 г.) і выпрацавалі, рэакцыйна змагаючыся з рознымі вучэньнямі дробнабуржуазнага сацыялізму, тэорыю і тактыку рэвалюцыйнага ПРАЛЕТАРСКАГА САЦЫЯЛІЗМУ або камунізму (марксызму). (Глядзеце творы Маркса гэтай эпохі, 1844—1848 г. г.). У 1845 г. Маркс, па настойваньні прускага ўраду, як небясьпечны рэвалюцыянэр, быў высланы з Парыжу. Ён пераехаў у Брусэль. Увесну 1847 году Маркс і Энгельс далучыліся да патаемнага прапагандысцкага таварыства «Саюз камуністаў», прынялі выдатны ўдзел на II зьезьдзе гэтага саюзу (лістапад 1847 г. у Лёндане) і, па яго даручэньні, склалі вышаўшы ў лютым 1848 г. вядомы «Маніфэст камуністычнай партыі». У гэтым творы з геніяльнай яснасьцю і яркасьцю, абмалёваны новы сьветапогляд, пасьлядоўны матэрыялізм, які ахапляе і галіну сацыяльнага жыцьця, дыялектыка, як найбольш усебаковае і глыбокае вучэньне аб развіцьці, тэорыя клясавай барацьбы і сусьветна-гістарычнай рэвалюцыйнай ролі пралетарыяту, творца новага, камуністычнага грамадзтва.

Калі адбылася лютаўская рэвалюцыя 1848 г., Маркс быў высланы з Бэльгіі. Ён прыехаў зноў у Парыж, а адтуль, пасьля сакавіцкай рэвалюцыі, у Германію, іменна ў Кельн. Там выходзіла з 1 чэрвеня 1848 г. па 19 мая 1849 г. «Новая рэйнская газэта»; галоўным рэдактарам яе быў Маркс. Новая тэорыя была бліскуча пацьверджана ходам рэвалюцыйных падзей 1848-1849 г. г., як пацьвярджалі яе потым усе пралетарскія і дэмакратычныя рухі ўсіх краін сьвету. Перамогшая контр-рэвалюцыя спачатку аддала Маркса пад суд (апраўдан 9 лютага 1849 г.), а потым выслала з Германіі (16 мая 1849 г.). Маркс адправіўся спачатку ў Парыж, быў высланы і адтуль пасьля дэманстрацыі 13 чэрвеня 1849 году і паехаў у Лёндан, дзе і жыў да самай сьмерці.

Умовы эміграцыйнага жыцьця, асабліва наглядна ўскрытыя перапіскай Маркса з Энгельсам (выдана ў 1913 г.), былі надзвычай цяжкія. Няхваткі прос ста душылі Маркса і яго сям'ю; толькі

2 сьнежня 1881 году памерла яго жонка, 14 сакавіка 1883 г. Маркс ціха заснуў навекі ў сваім крэсьле. Ён пахаваны разам са сваёй жонкай на могілках Хайгэйт у Лёндане.

Н. ЛЕНІН.

Марксызм і нацыяналізм

Марксызм непрымірымы з нацыяналізмам, будзь ён самы „справядлівы“, „чысьценькі“, тонкі і цывілізаваны, Марксызм высоўвае на месца ўсякага нацыяналізму,—інтэрнацыялізм, зьліцьцё ўсіх нацый у вышэйшым адзінстве, якое расьце на нашых вачох з кожнай вярстой чыгункі, з кожным міжнародным трэстам, з кожным (міжнародным па сваёй эканамічнай дзейнасьці, а затым і па сваіх ідэях, па сваіх імкненьнях) рабочым саюзам.

Прынцып нацыянальнасьці гістарычна няўхільны ў буржуазным грамадзтве, і, лічачыся з гэтым грамадзтвам марксыст у поўнай меры прызнае гістарычную законнасьць нацыянальных рухаў. Але каб гэта прызнаньне не ператварылася ў апалёгію нацыяналізму, трэба, каб яно абмяжоўвалася найстражэй толькі тым, што ёсьць прагрэсыўнага ў гэтых рухах,—каб гэта прызнаньне не вяло да зацямненьня пралетарскай сьвядомасьці буржуазнай ідэалёгіяй.

Н. Ленін.



Членскі білет 1-га Інтэрнацыяналу. Сярод подпісаў — подпіс МАРКСА

Свабоду вязьням Скотсбора

Адозва Цэнтральнага Камітэту МОПР'у СССР

Амэрыканскія капіталісты пад напорам мільёнаў працоўных усяго сьвету прымушаны былі пайсьці на перагляд справы вязьняў Скотсбора. Каты Алябамы, якія паслалі юнакоў Скотсбора на электрычнае крэсла, зноў стараюць вакол гэтага працэсу атмасфору суда лінча.

Рабочыя, работніцы, калгасьнікі, калгасьніцы, інжынэры і тэхнікі, вучоныя, мастакі, пісьменьнікі, пралетарскае студэнцтва, служачыя, самаатужнікі і ўсе працоўныя Савецкага саюзу! Магутны голас пратэсту працоўных усяго сьвету ўжо адпойчы прыпыніў выкананьне сьмяротнага прыгавору над вязьнямі Скотсбора. Але небясьпека кары сьмерцю і лінчаваньня ня мінула.

Суд перанесен у той-жа штат Алябама—у горад Дэкатура.

Узьнімайце яшчэ вышэй баявы сьцяг пратэсту супроць юстыцыі лінча, супроць клясавай расправы з рэвалюцыйнымі рабочымі, супроць разгулу цывілізаваных катаў і распальвальнікаў расавай нянавісьці.

У адказ на разбэшчаны белы тэрор у краінах капіталу аб'ядноемся пад сьцягамі МОПР'у для справы дапамогі барацьбітом рэвалюцыі. Павысім рэвалюцыйную пільнасьць да ворагаў са цыялістычнага будаўніцтва.

Па-бальшавіцку правядзем на калгасных палёх першую вясну другой пяцігодкі.

Выкапаем народна-гаспадарчы плян першага кварталу.

Прэч рукі фашысцкіх турэмшчыкаў ад барацьбітоў пралетарскай рэвалюцыі!

Няхай жыве міжнародная клясавая салідарнасьць працоўных!

Цэнтральны камітэт МОПР'у СССР.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

АБ ПЕРАЗАКЛЮЧЭНЬНІ КАЛДАГАВАРОЎ НА 1933 г.

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ, Наркамцяжпраму, Наркамлёгпраму, Наркамлесу, Наркамснабу, Упаўн. НКСаўгасаў ад 7-III 1933 году

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам камуністычнай партыі і не Ленінскага ЦК рабочая кляса БССР, як і ўсяго Савецкага саюзу, атрымала сусьветна-гістарычныя перавагі на фронце сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны, у барацьбе за пасьпяховае завяршэньне першай пяцігодкі за 4 гады.

Рагней адсталая, прычэпчаная царская калёнія з вускім клаба разгорнутай прамысловасьцю — Савецкая Беларусь, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, пры сыстематычным дапамозе Савецкага саюзу, перакаторана ў адзіну буйных фабрык і заводаў, калгасаў і саўгасаў.

За перыяд першай пяцігодкі пабудаваны звыш 20 буйнейшых фабрык і заводаў, як БелДРЭС, Гомсельмаш, «Сьцяг індустрыялізацыі», Бабруйскі і Гомельскі дрэвапрацоўчыя камбінаты, крывалежная фабрыка «КІМ», фабрыка штучнага валакна, Аршанскі мясакамбінат і рад інш.

Капіталаўкладаньні ў прамысловасьць за 1-ю пяцігодку складаюць 251 мін. руб., супроць запраектаваных 226 мін. руб.

Пасьпяховае выкананьне першай пяцігодкі забясьпечыла карэннае паляпшэньне дабрабыту рабочай клясы: поўнасьцю ліквідавана безпрацоўе, у вытворчасьць упягнута ў аналных разьмерах жаночая праца, колькасьць рабочых толькі ў сакоўнай і рэсп. прамысловасьці павялічылася на БССР з 86.000 — у 1927 г. да 94.000 — у 1932 годзе. Зьмін 90 проц. усіх рабочых прамысловасьці пераведзена на 7-гадзінны рабочы дзень. Зарплата вырасла за перыяд першай пяцігодкі на 60 процантаў. З кожным годам павялічваецца фонд на паляпшэньне аховы адарэньня, жыльлёва-бытавых умоў і інш. Пераважная частка рабочых ахоплена грамадзкім харчаваньнем.

Усе гэтыя дасягненьні зьяўляюцца вынікам наўхільнага асьцыяцыўленьня генэральнай лініі партыі, вынікам пыскага разгортваньня сацыябарацьбы і ўдарництва, бяззьмянага росту вытворчай і палітычнай актыўнасьці рабочых мас.

На 1933 г., выходзячы з задач асваеньня магутнасьці існуючых і ўступаючых у эксплёатацыю новых прадпрыемстваў, а таксама і з наяўнасьці фондаў сыравіны — прырост прадукцыі прамысловасьці БССР устаноўлен паркцыяй і ўрадам у 22 проц., у параўнаньні з мінулым годам. Рост прадукцыйнасьці працы вызначаны, як мінімум, на 1933 г. — 13,5 проц. Зьніжэньне сабекошту па Наркамлёгпраму вызначана ў 3 проц., па Наркамцяжпраму — 7,66 проц., па Наркамлесу—1 проц., па Наркамснабу — 2,2 проц.

Рост сярэдняй заработнай платы вызначан у 4,7 проц., у тым ліку па прамысловасьці — 6,7 проц.

Побач з павялічэньнем зарплаты, урадам адпушчана 23.731 тыс. руб.; на паляпшэньне камунальнага будаўніцтва— 13.480 тыс. руб., на ахову працы і тэхніку бясьпекі па 5-ці паказаных Наркаматах — 617.400 руб., на папаўненьне харчовай базы (прыгарадн. гаспадарка) — 2.180 тыс. руб., на капіталаўкладаньні па кадрах — 8.050 тыс. руб.

Каб выканаць задачы 1933 году патрэбна ўзмацнець штодзённая бальшавіцкая барацьба з боку гаспадарчых і прафесіональных арганізацый, усіх рабочых, ІТР, служачых; рашучая перабудова ўсёй работы на вытворчасьці, усяго кіраўніцтва.

Адным з галоўнейшых вагароў у справе забясьпячэньня выкананьня пляну зьяўляецца калдагавор, роля якога значна ўзрастае ў бягучым годзе, у сувязі з выраўнаньнем цэнтральнай задачы, пастаўленай абавязковым пленумам ЦК і ЦКК УсесКП(б) і тав. Сталіным — **«Асваеньне новай тэхнікі, сур'ёзнае ўзьмацьненне прадукцыйнасьці працы, сур'ёзнае скарачэньне сабекошту».**

Наркаматы і ЦСПСБ прапануюць гаспадарчым і прафесіональным арганізацыям неадкладна прыступіць да перагаворкі калдагавораў, кіруючыся пастановай наркаматаў і УсесЦСПС ад 5-га сакавіка і ў суадпаведнасьці з гэтымі дырэктывамі, — пастанаўляюць:

а) Абавязаць трэсты і ЦП саюзаў, дырэктараў фабрык і ФЗМК неадкладна прапрацаваць з прыцягненьнем шырокіх рабочых мас і ІТР, канкрэтныя мерапрыемствы па забясьпячэньні сыстематычнага росту прадукцыйнасьці працы і зьніжэньня сабекошту, як лепшае скарыстаньне механізмаў, абсталяваньня, увядзеньне новай механізацыі, давядзеньне рабочай сілы ў суадпаведнасьць з плянам і правільная расстаноўка яе па кваліфікацыі і патрэбах кожнага вучастку, выворачэньні, максымальнае скарачэньне ліку служачых, павышэньне іх напружкі і якасьці іх работы, поўнае ўшчальненьне рабочага дня, рашучае замацаваньне працэтарскай працэсьнасьці. Прапрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па зьніжэньні прастояў, браку і рашучае паляпшэньне якасьці прадукцыі. Ачысьціць цэх, кожнае рабочае месца ад вазалі, сьмецьцця. Правесьці ў жыцьцё ў вызначэньня па пляну тэрміны рацыяналізатарскія мерапрыемствы. Прапрацаваць мерапрыемствы па эканоміі сыравіны, матар'ялаў, па скарыстаньні адкідаў, пазіва і інш., устанавіўшы ўнутрыцэхавы кантроль над іх правядзеньнем. Усе асноўныя мерапрыемствы, якія павінны забясьпечыць рост прадукцыйнасьці працы і зьніжэньне сабекошту, абапаўзкова канкрэтна ўказаць у калдагаворы.

б) Паскорыць перагляд устаўрэўных і ўчна паніжаных норм з тым, каб скончыць гэты перагляд да 1-га красавіка. Да перагляду норм прыцягнуць найбольш старых калгаў рабочых-ударнікаў. Перагляд норм праводзіць на аснове тэхнічнага нармаваньня, а таксама вопытна-статыстычных даных аб фактычнай выпрацоўцы. Устаноўленыя нормы і выдзеленыя расцэнкі замацаваць на год, дапускаючы іх перагляд выключна адны ўзгадзеньні арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў, якія маюць уплыў на павялічэньне прадукцыйнасьці працы і шэры зьніжэньні памыловых нормаў. Абавязкова ўключыць у калдагавор абавязкі адміністрацыі, арганізаваць інструктаж па асваеньні новых тэхнічна-ўпрутаваных нормаў.

Абавязаць дырэктараў прадпрыемстваў і ФЗМК 15-га сакавіка і 1-га красавіка паведамць адпаведныя Наркаматы і ЦСПСБ аб ходзе перагляду норм і пра канчатковы вынікі з паказаньнем колькасьці перагледжаных нормаў, па якіх групах, і іх эфэктыўнасьць.

в) Прапрацаваць на кожным вучастку вытворчасьці, якія работы і прафесіі могуць быць пераведзены на выдзелышчыну, што абавязкова ўказаць у калдагаворы з вызначэньнем цьвёрдых тэрмінаў правядзеньня. Таксама неабходна вызначыць у калдагаворы, на якіх работах будзе праведзена тэхнарманаваньне.

Заклёпчы простую необмежаваную выдзелышчыну, як асноўную форму аплаты па колькасьці і якасьці працы, дапусьціць узьнікненьне прагрэсіўнай выдзелышчыны выключна на перасьмяканьне нормаў і толькі на вузкіх мясцох і ў тых выпадках, калі гэта мэтагодна і гарантуе эканамічны эфэкт.

Рэзэрваваць у межах зацьверджаных фондаў зарплаты неабходныя сродкі для правядзеньня прамфінпляну ІТР за перавыкананьне колькасных і якасных паказчыкаў прамфінпляну, а таксама на прэміраваньне пацраўмоцнітыкаў на памяншэньне цякучасьці абслугоўваемага абсталяваньня ў цэхах, скарачэньне часу на вытваральны рамонту, павялічэньне вучастку абслугоўваньня і г. д., узлічыўшы ў генэральныя зтоты цьвёрда вызначаньня сумы і сыстэму правядзеньня прамфінпляну.

г) Дырэктарам прадпрыемстваў і ФЗМК неадкладна прапрацаваць калгаравыя мерапрыемствы па паляпшэньні якасьці прадукцыі. Гаспадарчым і прафсаюзным арганізацыям прапрацаваць на працягу 2-х месяцаў стандарт гатункоўсьці, устанавіўшы дыферэнцыраваны расцэнкі ў залежнасьці ад гатункоўсьці. Праекты гатункоўных расцэнак унесьці ў жыцьцё выключна па ўзгадзеньні з адпаведным трэстам і Цэнтральным Праўленьнем саюзу.

д) У межах асыгнаваньняў па прамфінпляну вызначыць у калдагаворах калідарныя тэрміны правядзеньня ўсіх мерапрыемстваў па ахове працы і тэхніцы бясьпекі па кожнаму жыллоу будаўніцтву і рамонту існуючага жыльфонду, на пабудову ясьляй, садоў, клюбаў і пляцовак.

е) За час калдагаворнай кампаніі асаблівую ўвагу зьвярнуць на арганізацыю паляпшэньня кваліфікацыі рабочых і ІТР. У калдагаворы неабходна прадугледзець канкрэтныя пляны мерапрыемстваў па ахове рабочых тэхнічнай вучобай, без адрыву ад вытворчасьці. Асаблівую ўвагу зьвярнуць на павышэньне кваліфікацыі моладзі і жанчын, шляхам арганізацыі гурткоў, куўсаў. У калдагаворы агаварыць пункт аб забясьпячэньні памяшканьня для заняткаў неабходнымі прыладамі.

ж) Перавесьці ручнай за ўсёй прамысловасьці на адзіную 4-хразрадную сетку — 1—1,9. У межах вызначанага росту заработку ручнай працэсьці павышэньне ставак па шасьцібоных прадпрыемствах, дзе гэта прадугледжана планам, забясьпечыўшы ў першую чаргу павышэньне ставак у гарачых цэхах, на шкодных і цяжкіх работах.

ЦП саюзаў і гаспадарчым арганізацыям у новых калдагаворах устанавіць канкрэтныя аб'екты і тэрміны выкананьня будаўніцтва школ ФЗВ, устанавіўшы сыстематычны кантроль за выкананьнем тэмпа будаўніцтва і за своячасовым камплектаваньнем ФЗВ.

Побач з гэтым, у калдагаворах прадугледзець канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэньні пастаноўкі работы па падрыхтоўцы кадраў.

Па мясцовай прамысловасьці ўстанавіць тыя-ж прынцыпы па рэгулёваньні працы і зарплаты і парадак перазаключэньня калдагавораў, як па рэсп. і саюзнай прамысловасьці.

Наркаматы і Прэзыдыум ЦСПСБ адзначаюць стаўкі перад гаспадарчымі і прафесіональнымі арганізацыямі наступныя задачы:

а) Па Наркамлёгпраму забясьпечыць выкананьне ўстаноўленага партыяй і ўрадам на 1933 г. пляну выпуску прадукцыі па рэспубліканскай прамысловасьці на 319,3 мін. руб., у тым ліку па шэйнай прамысловасьці — 164 мін., сукурна-абутковай — 55 мін., трыкатажнай — 50 мін., бельняной — 6,2 мін., шкляной — 9,5 мін.

Узьвысіць прадукцыйнасьць працы на 9,9 і зьніжыць сабекошт прадукцыі на 3 процанты.

Рост зарплаты рабочых устанавіць 4,1, ІТР — 2,6 проц., вучням — 9 процантаў.

Давесьці разьмер зьдзельнічыны па прамысловасьці прапрацаванага зьдзельна часу да 60 проц.

Да 15-га красавіка перабудаваць тэхнарманаваньне і яго органы на аснове дырэктыў ЦСПСБ і Наркамлёгпраму. Абавязаць кіраўніцтвы прадпрыемстваў і ФЗМК забясьпечыць поўны інструктаж рабочых па асваеньні новых нормаў.

Адмяніць існуючую сыстэму прэрэсьцўна-зьдзельнай аплаты ўнутры нормы. Прамфінпляны асноўных вытворчых рабочых па трыкатажнай, ільняной, бавоўняна-папяровай і шарсьцяной галінах прамысловасьці праводзіць у строгай суадпаведнасьці з усесаюзнай генэральнай зводкі адпаведных галоўных кіраўніцтваў і ЦК саюзаў.

На папаўненьне жылфонду адпусьціць 2.287 тыс. руб., на сац.-культурнае будаўніцтва адпусьціць — 740.2 тыс. руб., на папаўненьне прыгарадных гаспадарак — 880 тыс. руб., сваротныя сродкі па рабочым забясьпячэньні — 500.000 руб., на ахову працы і тэхніку бясьпекі — 279,2 тыс. руб.

Прыступіць з 1-га красавіка да правядзеньня тарыфнай рэформы па скуранай прамысловасьці ў межах вызначанага фонду зарплаты. У астатніх галінах правесьці мерапрыемствы па рэгулёваньні зарплаты, ліквідацыі ўраўнілаўкі шляхам вызваленьня вядучых прафесій кваліфікаванай працы, а таксама шляхам устаноўленьня нармальных узаемаадносін паміж зарплатай вядзельнічыка і пайраменічыка.

б) Па прамысловасьці Наркамцяжпраму забясьпечыць у 1933 годзе выпуск прадукцыі ў цэнах 1926-27 г. на 61.630,6 тыс. руб., з іх па Белторфу — 8.500,9 тыс. руб., па будматар'ялах — 6.043,7 тыс. руб., БелМЭТО — 47.086 тыс. руб.

Узьвысіць прадукцыйнасьць працы на 15,9 проц., зьнізіць сабекошт прадукцыі на 7,66 проц.

Рост зарплаты ўстанавіць у 9,3 проц. Асыгнаваць на жылбудаўніцтва — 1.551 тыс. руб., на камунальнае будаўніцтва — 260.000 руб., на сац.-бытавое будаўніцтва — 519.400 руб., на ахову працы і тэхніку бясьпекі — 78.100 руб., на папаўненьне харчовай базы (прыгарадн. гаспадарка) — 245.000 р., сваротныя сродкі па рабочым забясьпячэньні — 300.000 руб.

в) Па прамысловасьці Наркамлесу забясьпечыць выпуск валавой прадукцыі на 224.441.100 руб., у тым ліку па Лесбелу — 105.734.600 руб., Белдрэву — 56.565.800 руб., па фанэрэтрэсту — 14.043.700 руб., па Белпапертрэсту — 27.628.000 руб., па Белкімлесу—6.465.000 руб. і мясцовай прамысловасьці — 17.306.800 руб.

Узьвысіць прадукцыйнасьць працы па Белдрэву на 20 проц., Лесбелу — на 7 проц., Белпапертрэсту — 58,9 проц., Белкімлесу — 11 проц., па мясцовай прамысловасьці на 21,7 проц.

Зьнізіць сабекошт па Белдрэву — 0,2 проц., па Лесбелу — 5,5 проц., Белпапертрэсту — 5,46 проц., па Белкімлесу — 0,8 проц.

Павысіць зарплату па Белдрэву на 3 проц., па Лесбелу — 6 проц., па Белпапертрэсту — 9 проц., Белкімлесу — 7 проц. і па мясцовай прамысловасьці на 3,8 проц.

На далейшае паляпшэньне і папаўненьне жылфондаў, камунальнага і культурна - бытовага будаўніцтва адпусьціць: Белдрэву — 140 тыс. руб., Лесбелу — 364 тысяч руб., Белпапертрэсту — 240 тысяч руб., Белкімлесу — 150 тысяч руб., па мясцовай прамысловасьці — 87 тысяч руб.

На ахову працы і тэхніку бясьпекі ўстанавіць — 122 тысяч руб. (акрамя рэспубліканскай прамысловасьці).

На прыгарадную гаспадарку адпусьціць 745.000 руб.

ЦП Лесдрэў, Лесаспляву і Папераперапрацоўкі, Лесбелу і Белдрэву, Белпапертрэсту і Белкімлесу — праластавіць да 1-га мая прапрацаваны матар'ял па правядзеньні тарыфнай рэформы.

г) Па Наркамснабу забясьпечыць выпуск прадукцыі на 1933 г. па рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці на 83.642.200 руб.

Узьвысіць прадукцыйнасьць працы па рэсп. і мясцовай прамысловасьці на 22 проц.

Павысіць зарплату рабочых па рэсп. і мясцовай прамысловасьці на 5 проц.

Зьнізіць сабекошт прадукцыі на 2,2 процанты.

Асыгнаваць на паляпшэньне жыльлёвага будаўніцтва 337.000 руб., на культурна-бытавое будаўніцтва — 142.000 руб., на ахову працы і тэхніку бясьпекі — 67.000 руб.

На стварэньне харчовай базы (прыгарадн. гаспадаркі) адпусьціць 205.000 руб. і сваротныя сродкі для арганізацыі рабочага снабжэньня — 200.000 руб.

д) Па Упаўн. НК Саўгасаў давесьці пагалоўе буйнай рагатай жывёлы па малочна - прамысловых саўгасах да 29.043 галоў, з іх па Менскаму малпрамтрэсту — да 12.831 галавы, па Гомельскаму да 11.530 галоў, па Віцебскаму — 4.682 галоў. Пагалоўе сьвіней — па Менскаму сьвінатрэсту — да 31.000 галоў, па Аршанскаму — да 29.300 галоў, па Магілёўскаму — да 30.700 галоў. Па Пэтушка-трусаводчаму трэсту давесьці пагалоўе курэй да 23.000 шт., качак — да 4.850, гусей — да 2.000, трусоў—да 1.000, буйнай рагатай жывёлы — да 1.780.

Забясьпечыць ураджайнасьць збожжавых у сярэднім па трэстах—9 цэнтн., у тым ліку па Менскім малпрамтрэсце — 9,7 цэнтн., па Гомельскаму — 9,5 цэнтн., па Віцебскаму — 9,7 цэнтн., па Пэтушка-трусаводчаму трэсту — 8,5 цэнтн., па Менскаму сьвінатрэсту — 9, па Аршанскаму сьвінатрэсту — 8,5, па Магілёўскаму сьвінатрэсту — 8,5, па Полемсьвінтрэсту — 9,3.

Давесьці ўдойнасьць кароў па Менскаму малпрамтрэсту — да 1.300 літр., па Гомельскаму — да 1.000, па Віцебскаму — да 1.300, на Пэтушка-трусаводчаму трэсту — да 1.200.

Забясьпечыць здачу мяса дзяржаве — 8.717 тон.

Здача дзяржаве малочнай прадукцыі (у пераводзе на масла) — 5.461.100 цэнтн.

Асыгнаваць на жылыёвае і культурна-бытавое будаўніцтва рэсп. трэстаў 556.300 руб., на тэхніку бясьпекі і ахову працы па тых-жа трэстах 56.100 руб.

Падрыхтаваць нарміроўшчыкаў — 163 чал. Давесьці колькасьць вучняў саўгасаўчу да 1.890 чал. Падрыхтаваць праз курсы спэцыялістаў сярэдняй і ніжэйшай кваліфікацыі 1.761 чал.

Прапусьціць праз курсы масавай кваліфікацыі 4.300 чал.

Абавязаць ЦП саюзаў і трэсты ў 2-хдзённы тэрмін заключыць генэральную згоду з канкрэтнымі паказчыкамі прамфінпляну (прадукцыйнасьць працы па асобных элементах, зарплата, зьніжэньне сабекошту, жыльбудаўніцтва, ахова працы і інш.) на кожнаму прадпрыемству ў межах вызначаных лімітаў і спусьціць іх на прадпрыемствы.

Аддзелу зарплаты і вытворчасьці ЦСПСБ і сэктарам працы наркаматаў прасачыць за своячасовым выкананьнем.

Накіраваць на прадпрыемствы на ўвесь час калдагаворнай кампаніі ўсіх кіруючых рабоўнікаў і ўвесь оклад інструктароў па ЦСПСБ, ЦП саюзаў і гаррайпрафсаветах, а на лініі гаспадарчых арганізацый і НКпрацы — кіруючы склад работнікаў.

Да кампаніі па перазаключэньні калдагавораў прыпусьціць неадкладна і забясьпечыць своячасовае ае да 1-га красавіка. Калдагаворы павінны быць заключаны на тэрмін з 1-га сакавіка 1933 г. да 1-га сакавіка 1934 г.

Гаспадарчым і прафсаюзным арганізацыям, адказным прадаўнікам, якія будуць прымацаваны да прадпрыемстваў на час калдагаворнай кампаніі, кан крэтызаваць пакаазчыкі прамфінпляну па асобных цэхах і вучастках вытворчасьці.

Непасрэднае кіраўніцтва і адказнасьць за правільнае правядзеньне перазаключэньня калдагавораў, за свая часовы і правільны перагляд нормаў і расцэнак — усклаасьці персональна на старшынь ЦП саюзаў, кіраўнікоў трэстаў, на дырэктараў прадпрыемстваў і старшынь ФЗМК.

Прэзыдыум ЦСПСБ і наркаматы папярэджваюць усе прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі, каб не пагаджаць у бягучым годзе тых скажэньні, якія мелі месца па ряду прадпрыемстваў у мінулым годзе, калі праект калдагавору не прапрацоўваўся ва ўмовах кожнага асобнага прадпрыемства, а падпісваўся адміністрацыяй і прафарганізацыяй, скапіраваны з прыкладнага калдагавору УсесЦСПС, альбо інш. тыпавога дагавору.

Кожны пункт калдагавору павінен быць дакладна і яскрава складзен.

НКпрацы даць паказаньні сваім мясцовым органам прыняць самы актыўны ўдзел у перазаключэньні калдагавору і забясьпечыць своячасовую іх рэгістрацыю (на працягу 2-х дзён).

Абавязаць гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі да 1-га мая забясьпечыць рабочых падручнікамі калдагаворам з тым, каб кожны рабочы ведаў абавязкі, якія выцякаюць з калдагавору для рабочых, адміністрацыі і прафсаюзаў і гэтым забясьпечыць штодзённы грамадзкі кантроль за іх выкананьнем.

Прафсаюзным і гаспадарчым арганізацыям правесьці пазавартальную масавую праверку выкананьня калдагавору — па пытаньнях прадукцыйнасьці працы і зарплаты і выдаткаваньня фондаў праверку праводзіць штомесячна, рашуча змагаючыся за ўзорную дысцыпліну ў выдаткаваньні фондаў зарплаты.

Абавязаць прафарганізацыі і ўпаўнаважаных ЦСПСБ і наркаматаў забясьпечыць удзел шырокіх рабочых мас, асабліва ўдарнікаў, на ўсёй рабоце па перазаключэньні калдагавораў, уцягнуць іх у прапрацоўку новага калдагавору, арганізуючы збор рабочых прапаноў.

Прапрацаваць сярод усёй рабочай масы і падагуліць на фабрычна-заводскай канферэнцыі вынікі работы брыгад, якія створаны на аснове дырэктыў ЦСПСБ (у спускані-лютым месяцы) для прапрацоўкі асобных пытаньняў, зьвязаных з праверкай старога і падрыхтоўкай да новага калдагавору.

Прэзыдыум ЦСПСБ і наркаматы ўпэўнены, што гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі, рабочыя і ІТР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, на аснове шырокага разгортваньня сацыябарацьбы і ўдарніцтва паміж асобнымі пахамі, групамі, брыгадамі, прафсаюзамі і асобнымі рабочымі — ператвораць перазаключэньне калдагавору ў найлепшую гаспадарча - палітычную кампанію і настойлівай бальшавіцкай рэалізацыяй 6-ці ўмоў тав. Сталіна і пастановы стуцлеўскага пленуму ЦК і ЦКК забясьпечыць пасьпяховае выкананьне заданьняў па павышэньні прадукцыйнасьці працы, зьніжэньні сабекошту і ўсяго пляну першага году другой пяцігодкі.

Старшыня ЦСПСБ З. КАВАЛЬЧУК.
Наркамлёгпрам ГРЫСЕВІЧ.
Упаўн. НКЦяжпраму АМБРАЖУНАС.
Упаўн. НКЛесу РОЗІН.
Упаўн. НКСаўгасаў ЖОЛУДЗЕЎ.
Наркамснаб ГЕАРГАДЗЭ.

ПРА КАНТРАКТАЦЫЮ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ УРАДЖАЮ 1933 г.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

У адпаведнасьці з пастановай Савету Працы і Абароны ад 26 лютага 1933 г. «Пра нарыхтоўку ільну і канапель ураджаю 1933 г.», Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Зацьвердзіць на 1933 г. план пасеву ільну па БССР у 260.000 га і канапель — 30.000 га. Прадставіць Наркамзамам план пасеву ільну і канапель па сэктарах і раёнах зацьвердзіць.

2. Закантрактаваць з ураджаю 1933 году: ІЛЬНУ ў пераводзе на валакно — 28.900 тон, у тым ліку: валакна сялянскай апрацоўкі — 12.200 т. і трасты для ільназаводаў (у пераводзе на валакно) — 16.700 т. (75.600 тон трасты), пянькі — 2.600 тон, у тым ліку пянькі-сырцу сялянскай апрацоўкі — 2.000 тон, трасты і саломы для ільназаводаў (у пераводзе на валакно) — 600 тон (трасты 3.400, саломы 1.000 тон), семя ільну — 23,000 тон, у тым ліку: селекцыйных — 1.500 тон, семя канапель — 1.500 т.

Прадставіць Упаўкамзагснк план кантрактацыі ільну і канапель па сэктарах і раёнах зацьвердзіць.

УВАГА: У кулацка-заможных гаспадарках кантрактацыя не праводзіцца, а ім даюцца сельсаветамі цьвёрдыя заданьні па посеве і здачы ўсёй валавой прадукцыі ільну і пянькі і ня менш 70 проц. семя.

3. Правядзеньне кантрактацыі ўсіх відаў прадукцыі ільну і канапель, а таксама правядзеньне ўсіх разьлікаў па кантрактацыйных дагаворах з усімі калгасамі і аднаасобнымі бядняцка-сераднякімі гаспадаркамі ўскладзьці на беларускую кантору Загатлён і Белкаапсаюз, якія заключаюць кантрактацыйныя дагаворы з кожным калгасам і групамі аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак Загатлён праводзіць кантрактацыю праз свае загатпункты, а Белкаапсаюз праз сваю сыстэму (райсагі), прычым у кожным раёне кантрактацыю праводзіць толькі адна арганізацыя.

Прадстаўленае Упаўкамзагснк разьмеркаваньне раённу памяж Загатільном і Белкаапсаюзам зацьвердзіць.

4. Абавязаць беларускую кантору Загатільну і Белкаапсаюз у 3-хдзённы тэрмін заключыць паміж сабой адпаведны дагавор на правядзеньне Белкаапсаюзам кантрактацыі і загатоўкі кантрактуемай прадукцыі для здачы Загатільну.

5. Кантрактацыю ільну і канапель пачаць безадкладна і скончыць на пазьней 25 красавіка 1933 г.

6. Устанавіць наступныя крайнія тэрміны здачы (продажу) закантрактаванай прадукцыі дзяржаве (у процантах да гадавога пляну здачы):

(у процантах)

Назва прадукцыі	Тэрміны здачы па месяцох					
	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Сьнежань	Студзень	Люты
Лён сялянскай апрацоўкі	5	15	25	35	20	—
Ільнатраста і салома	10	35	40	15	—	—
Пянька сялянск. апрацоўкі	—	—	20	30	40	10
Канапляні салома	—	30	40	30	—	—
Пенькатраста	—	—	40	60	—	—
Ільнасемя	30	65	25	10	—	—
Канапляное семя	—	30	45	25	—	—

7. Зацьвердзіць ператашнія загатоўчыя цэны на ўсе віды прадукцыі ільну і канапель, апрача семя канапель, на якое ўстанавіць цану ў 10,5 кап. за цэнтнэр-процант.

8. Прапанаваць Наркамзему, райвыканкомам і райкомам КП(б)Б:

а) для павышэньня ўраджайнасьці і павышэньня якасьці прадукцыі ільну і канапель адвесьці пад лён у першую чаргу канюшыніччы і ўзараную ўосень цаліну; пад пасевы канапель — старыя канаплянішчы і прысядзібныя вучасткі; арганізаваць поўнае унясеньне і скарыстаньне гною па ўстаноўленых нормах не ўсёй плошчы канапель і паравесьці суровы нагляд за калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнікамі аб своячасовасьці пасеваў і паляпшэньні якасьці апрацоўкі глебы, уборкі і абмалоту ільну і канапель і абавязкова дабіцца своячасовай праполкі ільну і выбаркі плоскуняў у 1933 г.;

б) шляхам давядзеньня плянаў пасеву да гаспадарак замацаваць пад пасевы канапель у 1933 годзе старыя канаплянішчы, часткова прысядзібную зямлю як тую, якая знаходзіцца ў агульным карыстаньні калгасаў, так і ў індывідуальным карыстаньні калгаснікаў і аднаасобнікаў, забясьпечыўшы агульную плошчу пасеву на гэтых зямельных вучастках у разьмерах, вызначаных па пляну пасеву канапель;

в) забясьпечыць з вясны 1933 году пераход ільнаводчых калгасаў на правільны севазварот, максымальна скарыстоўваючы наяўнае па БССР насьнне канюшыны для забясьпячэньня гэтых калгасаў;

г) зрабіць да 1-га жніўня 1933 году поўны рамонт усіх мачыльных ям, сушняў, сушыльна-мяльных і трапальных пунктаў па ільну і канаплях: нанава пабудаваць у калгасах да 1-IX—1933 г. 34 мачыльныя ямы па ільне і 20 буйных мачыльных ям для пянькі і 150 палепшаных сушняў з памяшканьнямі пры іх для мяцьця і трапаньня ільну і пянькі.

9. Абавязаць Белільнатрактарацэнтр і Белсельгасснаб забясьпечыць завоз у асноўныя ільнаводчыя раёны шырокахватных ільнацэрабілкі, ільна-чысьцілкі, ільнатрыеры, ільняныя і канапляныя малатарні і шасьцілапёравальныя мялкі для ільну і пянькі.

10. Прапанаваць Белільнаканаплябуду і Белтрактарацэнтру забясьпечыць неабходнымі сродкамі і абсталяваньнем ільназаводы, што будуюцца, з разьлікам скончэньня будаўніцтва іх да 1-га верасьня 1933 г. з тым, каб з 1-га кастрычніка 1933 г. працавала па БССР ня менш 70 ільназаводаў.

11. Даручыць Упаўкамзагснк т. Бэнэку і Наркамзему т. Рачыцкаму зацьвердзіць плян водпуску семя ільну і канапель па раёнах і ўстанавіць парадак водпуску яго, прадугледзеўшы першачарговы водпуск калгасам.

12. Адпусьціць для выдачы (продажу) здатчыкам ільну і пянькі ўраджаю 1933 г. 18.250 тон збожжа.

3 агульнай колькасьці збожжа для стымуляваньня пасеву і загатовак ільну і канапель адпусьціць вясной у часе сяўбы і праполкі 3.000 тон. Даручыць Упаўкамзагснк устанавіць раёны, кормы і парадак водпуску збожжа пасеўшыкам і здатчыкам ільну і канапель у простай запежнасьці ад якасьці адаваемай прадукцыі, прадугледзеўшы нормы выдачы калгасам, якія абслугоўваюцца МТС у сярэднім на 10 проц. вышэй норм, устаноўленых для калгасаў, якія не абслугоўваюцца МТС.

Устанавіць, што збожжа, якое атрымліваецца калгасамі ў парадку стымуляваньня пасеву і загатоўкі ільну і пянькі, разьмяркоўваецца выключна паміж калгаснікамі, якія фактычна працавалі па пасеве, прапоўцы, уборцы і апрацоўцы ільну і канапель.

13. Абавязаць Белкаапсаюз і Упаўнаважанага камітэту таварных фондаў забясьпечыць своячасовае атрыманьне фондаў прамтавараў, якія вызначаюцца для стымуляваньня пасеву і загатоўкі ільну і пянькі, мэтавы завоз і выдаткаваньне гэтых тавараў, прыцягваючы да адказнасьці вінаватых у скарыстаньні гэтых тавараў не па простым прызначэньні.

14. Устанавіць выдачу (продаж) расьлінага алею і мякухі здатчыкам семя ільну і канапель за кожны зданы цэнтнэр семя па наступных нормах:

а) для калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС — 3,5 кгр. алею і 5 кгр. мякухі;

б) для калгасаў, якія не абслугоўваюцца МТС — 3,2 кгр. алею і 4,5 кгр. мякухі;

в) для аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак — 2,5 кгр. алею і 4 кгр. мякухі;

г) для насеннаводчых калгасаў і здатчыкаў селекцыйнага і гатункоўга насеньня — 5 кгр. алею і 7 кгр. мякухі. Выдачу алею і мякухі рабіць на 50 проц. у часе здачы семя і 50 проц. у 1-м квартале 1934 г.

15. Даць у 1933 г. калгасам і аднаасобным бядняцка-сераднякім гаспадарам, якія сеюць лён і канаплі, наступныя ільготы:

а) усе пасевы ільну па канюшынішчы і цаліне, узаранай з восені, з таксама ўсе пасевы канапель у раёнах, згодна асобнага сьпісу, зацьверджанага СНК БССР, поўнасьцю вызваляюцца ад сельска-гаспадарчага падатку;

б) пасевы ільну і канапель падлягаюць грашовому акладному страхаваньню ад засухі;

в) увесь ураджай плоскуняў выбраны калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнікамі, не кантрактуецца і паступае ў поўнае распараджаньне калгасаў і аднаасобных бядняцка - сераднякіх гаспадарак.

16. Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі асобна адзначаюць, што выкананьне кожным кантрактантам узятых на сябе дагаворных абавязацельстваў па пасеве, прапоўцы, добрай уборцы і своячасовай здачы прадукцыі ільну і канапель дзяржаве зьяўляецца важнейшым абавязкам кожнага калгасу і кожнага працоўнага аднаасобніка.

Толькі пасьля выкананьня дзяржаўнага пляну здачы ільну і канапель калгас мае права бесьперашкодна распараджацца тай часткай прадукцыі, якая застаецца ў яго карыстаньні як для патрэб калгасу, так і для патрэб калгаснікаў.

Задача савецкіх і партыйных органаў БССР заключаецца ў тым, каб у 1933 г. дабіцца самай суровай дысцыпліны ў справе выкананьня кантрактантамі сваіх абавязацельстваў як на колькасьці і якасьці здаваемай прадукцыі, так і па тэрмінах здачы.

Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі абавязваюць мясцовыя савецкія і партыйныя органы і загатоўчыя арганізацыі да нядобрасумленных кантрактантаў ужываць жорсткія меры спагнаньня, пазбаўляючы іх ільгот, якія прадастаўлены гэтай пастановай для акуратных здатчыкаў ільну і канапель, як спынячыся перад жорсткімі рэпрэсіямі да тых, якія зпоэна зрываюць выкананьне сваіх абавязацельстваў, прынятых кантрактацыйнымі дагаварамі.

Адначасова з гэтым Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі абавязваюць беларускую кантору Загатільну, Белкаапсаюз, РВК і РК КП(б)Б забясьпечыць поўнасьцю для акуратных здатчыкаў ільну і канапель усе ільготы, якія ўстаноўлены гэтай пастановай.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б М. ГІКАЛО.
12 сакавіка 1933 г.

АБ МЕРАХ, ЯКІЯ ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЬ ПАСКАРЭНЬНЕ ТЭМПАЎ РАМОНТУ ТРАКТАРАЎ

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

У дадатак да прынятых мер ЦК і СНК лічаць неабходным прыняць наступныя меры:

Каманцыраваць упаўнаважаных ЦК і СНК у наступныя рашаючыя пункты рамонту трактараў:

Па Ільнатрактарацэнтры — лічыць, што

Вынікі выбараў у органы камунальнага самакіраўніцтва ў Германіі

БЭРЛІН, 14. Учора па ўсёй Прусіі праходзілі выбары ў органы камунальнага самакіраўніцтва, якія, як відома, былі распушчаны аднячасова з роспускам прускага ландтагу.

У Бэрліне нацыянал-сацыялісты разам з нацыяналістамі атрымалі абсалютную большасьць.

Вынікі па Бэрліну прадстаўляюцца ў наступным выглядзе:

З паданых усяго 2.572.563 галасоў (супроць 2.978.464 галасоў, якія былі паданы на выбарах 5 сакавіка) атрымалі:

Нацыянал-сацыялісты — **984.243 (86 мандатаў).**

Сацыял-дэмакраты — **565.943 (49 мандатаў).**

Камуністы — **499.847 (44 мандаты).**

Чорна-бела--чырвоны блёк (нацыяналісты і «сталёвы шлём») — **311.302 (27 мандатаў).**

Цэнтр—**119.939 (11 мандатаў).**

Народная партыя — **15.920 (2 мандаты).**

Хрысьціянскія сацыялісты — **14.365 (1 мандат).**

Дзяржаўная партыя — **52.671 (5 мандатаў).**

Такім чынам, урадавыя партыі маюць у сваім распараджэньні 113 мандатаў супроць 112 мандатаў астатніх партый. У большасьці іншых гарадоў Германіі правыя партыі атрымалі большасьць у гарадзкіх самакіраўніцтвах.

Арышты камуністаў ня спыняюцца

ЛЁНДАН, 14. Па паведамленьнях з Бэрліну, нацыянал-сацыялісты пасьля захвату муніцыпалітэту ў **Кёльне** зрабілі вобыск на кватэрах **камуністаў. 35 камуністаў арыштаваны.**

Капярэдадні ўсеагульнай забастоўкі гарнякоў у Англіі

ЛЁНДАН, 13. Канфэрэнцыя фэдэрацыі гарнякоў Паўднёвага Уэльсу пастанавіла **абвясьціць забастоўку на ўсіх шахтах Паўднёвага Узльсу,** у адзнаку салідарнасьці з гарнякамі Бадуосу, забаставаўшымі два тыдні таму назад.

Забастовачны рух у Францыі

ПАРЫЖ, 9. Згодна паведамленьня «Юманітэ», **забастоўка 6.000 тэкстыльшчыкаў у Армант'еры працягваецца.** Забастовачныя пікеты па-ранейшаму дзяжураць на ўсіх пастох.

1.200 воднікаў на рэках Рона і Сена таксама абвясьцілі забастоўку супроць зьмяншэньня зарплаты. **У Бордо** забаставала 500 партовых грузчыкаў.

10 проц. насельніцтва Аўстрыі—беспрацоўныя

ВЕНА, 11. Паводле даных аўстрыйскага эканамічнага журнала «Дэр Эстрэйхінэ Фольксвірт», на 1-га сакавіка ў Аўстрыі налічвалася каля 580.000 беспрацоўных, што складае 10 проц. насельніцтва Аўстрыі.

Фашысцкі тэрор ў Аўстрыі

ВЕНА, 13. Сёньня днём паліцыя гравяла старанныя вобыскі ў памяшканьні цэнтральных камітэтаў аўстрыйскай **камуністычнай партыі, МОПР'у і Міжрабпому,** а таксама **ў рэдакцыі «Ротэ Фанэ».**

Канфіскавана вялікая колькасьць партыйнай літаратуры і дакумантаў. Адначасова ў розных раёнах Вены былі зроблены шматлікія вобыскі ў кватэрах камуністаў. Паліцыя арыштавала 20 камуністаў. **Сярод арыштаваных — сакратар ЦК аўстрыйскай кампартыі тав. Копленігі кіраўнік рэвалюцыйнай прафпазыцыі Корнэр, сакратар камсамольскай арганізацыі Габлер і член ЦК МОПР'у Кубатста.**

Арышты рэвалюцыйных рабочых у Вэнгрыі

БЕНА, 12. Згодна паведамленьня з Будапэшту, у Вэнгрыі праводзяцца масавыя арышты па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да кампартыі. У прыватнасьці, арыштавана 50 трамвайшчыкаў-актывістаў рэвалюцыйнай прафпазыцыі, 21 работнік разумовай працы, у тым ліку пісьменьнік Оліўс Плош, прафэсар Іозэф Маджар і інш.

Масавыя арышты рэвалюцыйных рабочых у Японіі

ТОКІЁ, 13. Як паведамляе газэта «Хоці Сімбун-Рэнго», 12 сакавіка ў розных гарадох прэфэктуры Міе пачаліся масавыя арышты асоб, якія падазраюцца ў камуністычнай дзейнасьці. У гарадох **Мацусака, Іокаіці, Узімада** арыштавана звыш 100 чалавек.

У горадзе **Хімеве** арыштован рад рабочых тэкстыльных прадпрыемстваў па абвінавачэньні ў камуністычнай дзейнасьці. У арыштаваных знойдзена рэвалюцыйная літаратура.

УПАРТЫЯ БАІ ЗА ПРАХОД СЫФІНКОУ

МУКДЭН, 14. Згодна японскіх ваенных паведамленьняў, учора японскімі войскамі поўнасьцю скончана акупацыя праходу Губэйкоу. Кітайскія войскі ўмацоўваюць пазыцыі з паўднёвага боку Губэйкоу, адбіваючы японскія атакі. Разьбітыя кітайскія часьці адступаюць у паўднёва-заходнім напрамку, канцэнтруючыся ў горным раёне Імэнь (правінцыя Хобэй).

Паводле паведамленьня агенцтва Кокуцу, у Цыфінкоу адбываюцца жорсткія баі. Агенцтва ўказвае, што 29 і 30 кітайскія брыгады зрабілі дзьве контр-атакі. Баі ў гэтым раёне носяць асабліва ўпарты характар. Паводле слоў агенцтва Кокуцу, кітайскія войскі страцілі 500 чал. забітымі, японскія войскі — 13 забітымі і 22 параненымі. Пераход Цзычкнакаў ў рукі японцаў чакаецца 14 сакавіка. Войскі Лі Ні-фэд (былы губэрнатар Чахэру) канцэнтруюцца на захадзе граніцы Жэхэ, дзе сумесна з войскамі Фу Цзе-і, якія знаходзяцца ў Датуне, аказваюць садзейнасьць войскам Сун Тэнг-міна, якія высяцьняюцца з Жэхэ ў Чахар кавалерыйскай брыгадай Мо Це-цы.

***

ШАНХАЙ, 14. Як падае агенцтва «Гомі», кітайскія войскі пад камандваньнем Суп Чжо-сана пасьля некалькі дзён упартых баёў зноў занялі праход Сыфінкоу. Агенцтва ўказвае, што ў раёне Губэйкоу (які нібы ўтрымліваецца кітайскімі войскамі) атакі японскіх войск працягваюцца. 25-я панкінская дывізія нясе вялікія страты, камандзір дывізіі паранены.

31 МІЛЬЁН ІЕН НА МОРСКІЯ УЗБРАЕНЬНІ

Дадатковы бюджэт Японіі

ТОКІЁ, 14. Паводле паведамленьня «Ніці-ніці», савет міністраў 13 сакавіка зацьвердзіў дадатковы бюджэт на 1933-34 г. у разьмеры 64 мільёнаў іен, што павялічыла дэфіцыт на адпаведную суму. Дэфіцыт пакрываецца выпускам пазык. Звыш 31 мільёнаў іен з дадатковых бюджэтных асыгнаваньняў прызначаецца на ўзмацненьне морскіх узбраеньняў і каля 9 мільёнаў іен — на пакрыцьцё ўзросшых у рэзультаце падзеньня курсу іены плацяжоў па замежных пазыках. Дадатковы бюджэт не прадугледжвае аказаньня дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня. Паводле вестак міністэрства ўнутраных спраў, матар'яльныя страты ад зямлятрасеньня вылічаюцца ў паўтора мільёна іен. Аднак, агенцтва «Дэмпо-Цу-сін» паведамляе, што патрабуецца сума ў 43 мільёны іен для аказаньня дапамогі пацярпеўшым толькі ў прэфэктуры Іваці, Аоморы і Міягі.

***

ТОКІЁ, 14. Паводле даных міністэрства зямляробства, запазычанасьць сялянства Японіі ў цяперашні час складае 4.546 млн. іен. Па ацэнцы-ж эканамічных колаў, сапраўдная лічба гэтай запазычанасьці дасягае 6 мільярдаў іен.

Рузвэльт прапануе скасаваньне „сухога закону"

ВАШЫНГТОН, 13. У пасланьні Кангрэсу Рузвэльт прапануе неадкладна легалізаваць выраб і продаж піва і інш. напіткаў у мэтах узмацненьня дзяржаўных даходаў ад падатковага абкладаньня.

У ПАЗШ забаронены плацяжы ў золаце

НЮ-ЕРК, 13. Сёньня дазволена часткова аднавіць апэрацыі 50 н'юёрскім банкам, якія зьяўляюцца членамі фэдэральнай, рэзэрвовай сыстэмы. 9 банкаў, якія ўваходзяць ў фэдэральную, рэзэрвовую сыстэму, па-раней-шаму закрыты. Банкам, якія адкрываюцца, **забаронена вытвараць плацяжы ў золаце і рабіць зьдзелкі з замежнай валютай, за выключэньнем тых зьдзелак, якія зьвязаны з «нармальным гандлем» і зискурсіямі.**

ТЭХНІЧНАЯ КАНТОРА І КЛІЕНТУРА ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ ВАГОНЫ

Паляпшэньне звароту вагонаў усё яшчэ застаецца адным з цэнтральных пытаньняў на транспарце. І таму ўвага да яго ні ў якім разе не можа быць аслаблена. «Зьвязда» пісала ўжо пра недахопы ў рабоце тэхнічнай канторы Арлоўскага парку (Віцебск), якія зрываюць паляпшэньне звароту вагона. Адзак, і да сёньняшняга дня ніякага пералому няма. Як і раней, прыбываючыя для выгрузкі і сартыроўкі вагоны тэхнічнай канторай разьмяшчаюцца няправільна.

4-га лютага, напрыклад, прыбыло 5 вагонаў з грузам вялікай хуткасьці. Замест накіраваньня гэтых вагонаў да сараю № 8 для сартыроўкі, тэхнічная кантора няправільна памясьціла іх да другога сараю. У выніку — пяць вагонаў прасталяі лішнія суткі. У няправільнай разьметцы вінаваты тэхнічныя канторшчыкі **Мартынаў, Бляяеў і Сокалаў.**

Ня зьнішчаны выпадкі несвачасовага падыходу зборных цягнікоў, несвачасовага вывазу грузаў і разгрузкі кліентурай паданых на яе веткі вагонаў. Бязумоўна, гэта затрымлівае зварот вагонаў і павялічвае астачу. 7-га лютага на станцыі Віцебск астатак пад выгрузкай замест 15 заданых паводле нормы, складаў 86. Такія факты паўтараюцца кожны дзень.

Кліентура таксама несвачасова вывозіць грузы. 1 лютага толькі на адных навалачных шляхох таварнага двара засталося 70 вагонаў нявывезеных грузаў (гэта акрамя пакгаузаў): шчотачнага камбінату — 8 вагонаў, шэйнай фабрыкі — 14 вагонаў і г. д. Груз гэтых кліентаў праляжаў ад 3 да 6 дзён. Рэкорд пабіла аддзяленьне Белдзяржснабу. Яго вагон сталі стаіць ужо 49 дзён. Не адстае і прараб мопных токаў. А між тым з-за несвачасовага вывазу грузаў бываюць значныя прастоі пазьней паданых для выгрузкі вагонаў, лішняя трата манэўровых сродкаў пры расстаноўцы вагонаў у пошуках вольнага месца для іх разгрузкі.

Маюць месца выпадкі «очковтирательства» пры складаньні вестак астачы вагонаў па таварным двары. 4-га лютага цягнік № 776 прыбыў у 13 гадзін 40 мінут. Чатыры вагоны, прыбыўшыя з гэтым цягніком, былі паданы да 4 сараю, між тым яны ня былі паказаны ў астачы. Іх схаваў вагаўшчык **Дуброўскі.** Не паказан таксама быў вагон № 430509, які прыбыў 3 лютага, і вагон № 418959, які прыбыў 2-га лютага. Схаваў іх вагаўшчык **Сходкін.**

Наглядальнік таварнага двара **Арцем'яў,** хаця і ведаў аб гэтых фактах, ніякіх мер не прыняў. Ён наогул не зматаецца з «очковтирательством», не правярае работы вагаўшчыкоў і штам пуе іх весткі.

Час пакласьці канец такой злачынай пастаноўцы справы ў тэхнічнай канторы Арлоўскага парку. Трэба павысіць адказнасьць кожнага работніка за работу, якую ён выконвае. За кожны канкрэтны факт блытаніны, ня правільнай разьметкі вагонаў, «очковтирательства» вінаватыя павінны несьці суровую адказнасьць. Па гнілалібэральных адносінах да зрыўшчыкаў паляпшэньня звароту вагонаў трэба моцна ўдарыць.

Брыгада «Зьвязды» і «С. Т.»: Янка Дзьмітрыеў, Іваноў, Ткачык, Гаравацкі.

Паведамленьне АДПУ

Праведзеным АДПУ расьсьледваньнем раду шчачаканых, пасьлядоўна паўтараючыхся аварый, якія адбыліся за апошні час на буйных электрастанцыях (Маскоўская, Чэлябінская, Зуеўская, Златаустаўская) устаноўлена, што аварыі гэтыя зьяўляюцца рэзультатам шкодніцкай дзейнасьці групы злачынных элементаў з ліку дзяржаўных служачых у сыстэме наркамату цяжкай прамысловасьці, якая (група) паставіла сабе за мэту зруйнаваньне электрастанцый СССР (пазбэрсьніцкая дзейнасьць) і вывад са строю дзяржаўных заводаў, якія абслугоўваліся гэтымі станцыямі.

Расьсьледваньне паказала, што ў дзейнасьці гэтай шкодніцкай групы прымалі актыўны ўдзел таксама некаторыя служачыя ангельскай фірмы «Мэтрапалітэн-Віккерс», працуючыя ў СССР на падставе дагавору з гэтай фірмай аб тэхнічнай дапамозе прадпрыемствам электрапрамысловасьці СССР.

Арыштаваны на справе:

1. Гартэнштэйн Бэрнгард Барысавіч, галоўны інжынэр электратэхбуду «ВЭО»; 2. Крашэнікаў Міхаіл Дзьмітрыевіч, галоўны інжынэр першага «МОГЕС»; 3. Із'юраў Васіль Аляксандравіч, кансультант «ВЭО»; 4. Жыльнін Уладзімер Сьцяпанавіч, нам. заг. аддзелу «МОГЕС'у»; 5. Селіванаў Андрэй Паўлавіч, былы нам. заг. вытворча-мантажнага аддзелу трэсту Энэргабуд; 6. Сухаручкін Леанід Аляксандравіч, нам. галоўнага інжынэра першай «МОГЕС»; 7. Ястрабава Соф'я Дзьмітрыеўна, інжынэр «МОГЕС»; 8. Мураўаў Васіль Васільевіч, старшы інжынэр арг. энэрга; 9. Швальбах Альфонс Іванавіч, член ПЭС Галоўэнэрга; 10. Вільсон Іван Іванавіч, інжынэр «МОГЕС»; 11. Карынскі Вячэслаў Аляксеевіч, інжынэр Масэнэрга; 12. Параў Уладзімер Александравіч, старшы інжынэр Электраімпарту; 13. Гусеў Васіль Аляксеевіч, начальнік электрастанцыі мэталюргічнага заводу ў горадзе Златаўсьце на Урале; 14. Гасўскі Адольф Станіслававіч, галоўны механік механічнага заводу ў горадзе Златаўсьце на Урале; 15. Салоў Васіль Сідаравіч, галоўны электрык мэталюргічнага заводу ў Златаўсьце на Урале; 16. Вітыцкі Мікалай Пятровіч, галоўны інжынэр Чэлябдрэсу на Урале; 17. Нэндэр Міхаіл Фёдаравіч, старшы інжынэр сэктару эксплёатацыі Галоўэнэрга; 18. Патулаў Аляксандр Уладзімеравіч, інжынэр Масэнэрга; 19. Калакуцкі Фёдар Аляксеевіч, інжынэр Шатурскай ДЭС; 20. Лавашаў Канстантын Іванавіч, інжынэр «МОГЕС»; 21. Зорын Мікалай Рыгоравіч, інжынэр Масэнэрга; 22. Ялавецкі Уладзімер Антонавіч, інжынэр Масэнэрга; 23. Кручэтаў Генадзі Пятровіч, інжынэр Масэнэрга; 24. Марын Міхаіл Аляксеевіч, інжынэр Масэнэрга; 25. Маргідсон Барыс Мікалаевіч, інжынэр Саюзэлектра; 26. Торнтон Леслі, галоўны мантажны інжынэр фірмы «Мэтрапалітэн—Віккерс»; 27. Монкгаус Аллан, прадстаўнік фірмы «Мэтрапалітэн—Віккерс»; 28. Макдональд Вільям, інжынэр фірмы «Мэтрапалітэн Віккерс»; 29. Кушэ Джон, інжынэр фірмы «Мэтрапалітэн Віккерс»; 30. Нордвол Чарлі, манцёр фірмы «Мэтрапалітэн—Віккерс»; 31. Грэгорн, манцёр фірмы «Мэтрапалітэн Віккерс».

Пасьля допыту вызвалены з адабраньнем падпіскі аб нявыезьдзе: Селіванаў Андрэй Паўлавіч, Швальбах Альфонс Іванавіч, Ястрабава Соф'я Дзьмітрыеўна, Монкгаус Алан, Нордвол Чарлі.

Сьледзтва працягваецца.

Ліст брыгады актораў

Трыкупнік Першага Беларускага Дзяржаўнага тэатру выдучыў, згодна пастановы ЦК КП(б)Б, для ўдзелу ў падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы брыгаду ў колькасьці 14 чал.

У праграме брыгады: п'еса «Бадзькцішына» — рэпрыянт, спэцыяльна зроблены для пастаноўкі гэтай п'есы на сямых маленькіх пляцоўках, таксама канцэрт з 9 нумароў. Зроблены зьнэцыяльныя дэкарацыі. Апрача мастацкіх выступленьняў у плян работы брыгады ўваходзіць таксама выпуск насьценных газэт у калгасах, прысьвечаных пытаньням падрыхтоўкі да сяўбы. Для гэтай работы ў брыгаду ўвайшлі літаратурныя працаўнікі, а таксама мапыністка. Брыгада апрача гэтага павінна радыё-перасоўку. Брыгада павінна была па пастанове ЦК КП(б)Б выехаць 5-га сакавіка. Да гэтага тэрміну брыгада была поўнасьцю падрыхтавана. Але своячасовы выезд брыгады ня быў арганізацыйна падрыхтаваны. Гэта непадрыхтаванасьць да выезду цягнецца і да гэтага часу. Гэта непадрыхтаванасьць праяўляецца ў тым, што адпаведныя арганізацыі нат моцуць ніяк асыгнаваць неабыліхую суму грошай на набыцьцё валёнак, аплату пераезду, сутачных працаўнікам. Брыгада павінна абслужыць пры раёны: Лагойскі, Плешчаніцы і Вягомльскі, даць каля дваццаці мастацкіх выступленьняў, выпусьціць восем насьценных газэт і г. д. Затрачана шмат энэргіі, працаўнікі падарыраму ўключыліся ў работу па падрыхтоўцы мастацкай праграмы, а з выездам да гэтага часу нічога ня вырашена.

Мы — брыгада — паспрабуем ад адпаведных арганізацый адказу і ўказаньня канкрэтных пінаватых у зрыве такой важнай кампаніі, як своячасовы выезд мастацкай брыгады на падрыхтоўку весьнавой сяўбы. Як нам вядома, у такім-жа самым становішчы знаходзяцца і брыгады іншых тэатраў і насуп мастацкіх прадпрыемстваў гораду.

14 подпісаў.

ХРОНІКА

★ **Усебеларуская мастацкая галерэя** арганізуецца ў Менску. Для галерэі будуць выкарыстаны калекцыі малярства і скульптуры былога мастацкага аддзелу дзяржаўнага сацыяльна-гігарычнага музэю і інш. экспанаты.

★ **Паход за санмінімум** з посьпехам правяла віцебская санітарная станцыя. У часе паходу 1.500 шкоднікаў арганізаваным парадкам пакідалі лазьню. Пры зарэзьервінай больніцы арганізавана новая дэзынфэкцыйная камэра.

★ **1.500 тыс. руб.** адпушчана шкляпрэстам на пашырэньне барысаўскай гуты імя Дамбаля. На лупе будзе пабудавана другая ванная печ для вырабу высокачастотнага пункова на пашыньня.

★ Перны па Заходняй чыгунцы **радыёфікаваны рабсчы - цягнік** курсуе па лініі Гомель—Церахаўка і ў бок Буда-Кашалёва.

★ **Новы хлебазавод** на пры печы будзе будавацца ў бацучым годзе ў Жлобіне.

Паведамленьне

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 17, 18 сакавіка т. г., у 10 гадз. раніцы ў м. Талачыне будзе працаваць выязная ПТ ЦКК па разгляду партпогрэшаў Талачынскага і Крупскага раёнаў.

Выклікаюцца наступныя т. т.

На 17 сакавіка 1933 г. у Талачыне:

Камароўскі, Сурдаў М. Е., Якубоўскі Ф. Н., Кастрыгін П. Н., Вайнэр В. Я., Сьвірыдзевіч С. Ц., Клімовіч Ц. І., Ермакоў Я., Грышмакоў Бар., Калінoўскі І. К., Жукоўскі Ц. В., Пуковіч М. Н., Чарнушчын Я. К., Капасуноў Г. Л., Рашотнікаў М. А., Барцоўскі І. А., Кулякоў В. Я.

На 18 сакавіка 1933 г. у Талачыне:

Кроер С. Н., Грунберг З. О., Жданові Я. Я., Далуцанка А. Е., Тарасевіч Зах., Роззман Вас., Шэрпіла Пётра, Дубавец С. Я., Грушэцкі Я. Т., Курлып І. М., Барадач П. С., (Крупскі раён), Сяргун В. Ф., Глікман Я. М., Юркевіч В. Н., Пір М. К., Буцько Янка.

Таварышом, якія выклікаюцца, неабходна прадставіць на ПТ ЦКК характарыстыкі ячэек аб апошняй працы.

Член ПК ЦКК КП(б)Б — БЛОНШТЭЙН.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Аргкамітэт ССП БССР
Дом Пісьменьніка.
СЁНЬНЯ, 15 сакавіка ў 7 гадзін
ВЕЧАР, прысьвечаны 50-ці годзьдзю са дня сьмерці Карла Маркса.
З дакладамі выступяць акад. С. Я. Вельфсон і Я. А. Бранштэйн.
УВАХОД ВОЛЬНЫ.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ-1)
Маст. кіраўн. ЛІТВІНАЎ, Л. І П. ТУР.
СЁНЬНЯ
ЗЯМЛЯ І НЕБА
п'еса ў 4-х дзеях.
Пачатак у 8 г.

Памяшк. Яўр. Дома Тэатру (вул. Валадарскага, 7, тэл. 21-813)
СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА
МЮЗІК-ХОЛ
Новая праграма
Штодзенна 2 выступленьні.
Пачатак 1-га у 8 г. увеч., 2-га—у 10 г. увеч.
Па калектыўных заяўках скідка.
Прымаюцца заяўкі на культпаходы.

Інтэрнацыянал. Каса—ад 12 г. дня. Мастацкі фільм ДАЧКА РАФКЭ
Пралетары. КАСА—ад 12 г. дня. Новы сав. мастацкі фільм ВОЧЫ АНДОЗІЯ драма ў 7 частках.

КІНО СПАРТАК
З 15 САКАВІКА
Замежны фільм
ДОННА ЖУАНА
Камедыя ў 9 частках.
Штодзенна 5 сэансаў. Каса—ад 1 гадз. дня.

КІНО-ТЭАТР Чырвоная Зорка
З 15 сакавіка і штодзенна
Мастацкі фільм, вытворчасьці ДЗЯРЖКІНПРАМГРУЗІІ
НАЕЗЬНІК з Уайльд Вэста (ХТО ВІНАВАТЫ)
абедзьве сэрыі ў адзін сэанс
Прыгодніцкі фільм у 2-х сэрыях.
Рэж. А. ЦУЦУКАВА
У гал. ролі НАТА ВАЧНАДЗЭ, КОТЭ МІКАБЭРЫДЗЭ, Ц. ЦУЦУНАВА, Е. ЧЭРКЕЗЕШВІЛІ І ІНШ.
Звыш праграмы—кіно-хроніка Саюзкіно.
Штодзенна 4 сэансы. Пачатак у 6, 7-30, 9 і 10-30. Каса—ад 1 гадз. дня.

МЕНГАРБЮРО САЮЗДРУКУ
даводзіць да ведама ўсіх установаў, прадпрыемстваў і індывідуальных падпісчыкаў, што
падпіска
на газэты і часопісы на 2-гі квартал 1933 г. (красавік—чэрвень)
будзе прымацца толькі
да 20 сакавіка.
Падпісацца можна таксама і ва ўсіх кіёсках.
ПАСЬПЯШАЙЦЕСЯ ЗДАЧЫ ПАДПІСКУ.
Менгарбюро Саюздруку.

Інстытут Масавага Заочнага і вучэбнага Партактыву пры ЦК КП(б)Б.
УВАГА!..
17-га сакавіка, у гадзін вечар
радыёлекцыя партвучобы.
„Калгасная вытворчая брыгада ў падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы"
(лектар т. ЗАЛЕСКІ).

ДЗЯРЖАЎНАМУ ВЫДАВЕЦТВУ БЕЛАРУСІ
ПАТРЭБНЫ
на сталую працу:
Стэнэрадэктары,
Карэктары,
Старшы бухгальтар,
Бібліятэкар,
Машыністкі,
Тэхнічны сакратар.
Звяртацца—Савецкая, 59, канцылярыя выдавецтва.

БЕЛВОДГАС
даводзіць да ведама ўсіх установаў, якія не заключылі
ДАГАВАРОЎ
на мэліярацыйныя работы і пабудову буравых студняў, іх абстаўленьне насосамі і пабудову водапроводаў у 1933 г., што яны павінны заключыць іх
да 20 сакавіка,
пасьля якога тэрміну работы да выкананьня
прымацца ня будуць.
БЕЛВОДГАС, Менск, Энгельса, 28.

16-га сакавіка г. г., роўна ў 7 гадзін вечара ў памяшканьні Дзяржтэатру адбудзецца

аб'яднанае пасяджэньне

пленумаў ГК і ГКК КП(б)Б, Гарсавету, гарпрафсавету і гаркому ЛКСМБ

сумесна з цэнтральнымі, партыйнымі, прафэсыянальнымі і грамадзкімі арганізацыямі і ўдарнікамі прадпрыемстваў гор. Менску,

прысьвечанае 50-годзьдзю з дня сьмерці Карла Маркса.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Карл Карыс і сусьветна-гістарычнае значэньне марксызму-ленінізму (дакладчык тав. ГОРЫН).

Члены ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ГК і ГКК КП(б)Б, ЦК і ГК ЛКСМБ, ЦВК, СНК, Гарсавету, ЦСПСВ і ГСПС праходзяць па сваіх мандатах.

Запрашальныя білеты для ўдарнікаў разьмяркоўваюцца праз ГСПС.

ТАБЛІЦА

9-га тыражу выйгрышаў пазыкі „ПЯЦІГОДКА—ЗА 4 ГАДЫ",

які адбыўся ў г. Віньніцы 25—28 лютага 1933 году

А. Выйгрышы па 200 рублёў прыпалі на аблігацыі наступных сэрый бяспроцентна-выйгрышнага выпуску:

№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый
00304ш	12242	23232	33511	44137	55121	66097	77338	88617
00338	12295	23373	33525	44150*	55382	66220	77870	88682
00358	12450	23442т	33743	44350	55408	66298	77881	88700
00586	12586	23563	33924	44662	55494	66363	77996	88753
00659	12703	23594	33930	45790	55602т	66493	78000	88758
00922	12867	23697	34580	45847	55656	66757	78006	88773
01100	13209	23965	34676	45850	55706	66966	78230т	89035
01230	13216	24126	34923	45887	55929	67191	78353	89136
01381	13319	24269	35019	46224т	56175	67223	78893	89160
01396	13365	24341т	35039	46227	56213	67321	79182	89597
01421*	13577	24538т	35079	46378	56478	67574	79218*	89643
01704	14049	24716	35188	46572	56684т	68316	79357	90209
01874	14146	24727	35249	45581	56712	68414	79430	90234т
02127	14434	24900	35365	46700	56830	68464	79651	90401*
02291*	14496	24919	35450	46713	56882т	68488	79794	90460
02323	14592	25016	35568	46724	56994	68553	80057	90684
02330	14704	25105	35653	47016	56996	68944	80145	91330
02689	14880	25266	35885	47090	57304	69065	80148	91517
02967	14947	25455	35823	47113	57340	69119	80259	91522
03355	15030	25493	35826	47944	57492	69125	80547	91631ш
03825	15195	25865*	36237	48332ш	57666	69177	80736	91671ш
03835	15347	26079	36402	48562	58015	69279	80865	91927
03874	15407	26197	36643	48663	58475	69650	80900	91963
03946	15512	26307	37415	49042т	58589	69875	81014	91963
04099*	15613	26437	37509	49449	58694	70220ш	81278	92182
04250	15720	27222	37529	49586	58822	70452	81348	92432
04616	15784	27283	37911	49629	58901	70572	81599	92523
04653	15854	27364	38095	50678т	59209	70814ш	81612	92663
04713	16172	27404	38149	50712	59420	71176ш	81716	92703
04993	16354	27484	38172	50759	59493	71435	81740	93069
05344	16512	27583	38362	50890	59513	71647	81741	93775
05437	16538	27797	38463	50941	59553	71906	81829	93878
05476	16732*	27823	38594	51014	59582	72530	82540	93953
05526	16805	27940	38669	51194	59628*	72697	82378	93969
05566т	16900	28097	39468*	51250	59938	72735	82853	93979
05635	16998*	28107	39608	51337*	60139	72766	82892	94015*
05666	17107	28354	39981	51622т	60532	72851	82992	94255
06020	17226	28628	40134	51741	60829	78119	83103	94447
06059	17283	28887	40174	51782	61128	73373	83304	94971
06206	17681	28932ш	40297	51791	61316	73587	83349	95322ш*
06540	17823	29037	40358	51800	61322	73819	83617	95592*
07456	17846т	29127	40364	52105	61357	73903	83727	95715
07725	17890	29144	40589	52252	61538	73985	83934	95930
07762	18618	29337	40610	52412	61591	74068	84036	96363
07865*	18657	29583	40714	52449	61640	74156	84070	96448
08120	18772	29862	40724	52522	62044	74332	84341	96493
08165	19089	29940	40817	52577	62180*	74430	85194	96532ш
08593	19122	30049	41028	52649	62240	74717	85720	96832
08734	19160	30393	41189	52676	62345	74916	85851	96863
08912	19272	30429	41421т*	52895	62722*	74925	86143	97058
09049	19609	30636	41449	52995	62740	75059	86198	97064
09085	19618	30736	41724	53106	62803ш	75511	86576	97154
09198	20094*	31003	41953	53430	63297	75567	86596	97205
09430	20200	31050	41973	53487	63341	75955	86804	97363ш
09494	20230ш	31550	42119	53673	63401	76080	86871	98639
09559т	20486	31685	42164	53761	63571	76147	87063	98804
09906	20666	31768	42817	53939	64348	76211	87303	98952
09933т	20795	32062	42953ш	53978	64365	76425	87377	98957
10059	20801	32480	43251	54043	64372ш	76524	87429т	98989
10116	21353	32491	43324	54727*	64643	76556	87431	99043
10667	21425	32650	43355	54889т	64688ш	76629	87510ш	99082
10852	21712*	32680	43461	54986	64786	76971	87753	99483
11002	22661	32848	43577	55008	64821	77067	87861	99670
11163*	22995	32912	43605	55013	64873ш	77209	87966	99803
11328	23210	33094	43995	55075	65136	77264	88080	99926
11825	23221	33160	44026	55082	65678	77326	88118	99984
11907	23242	33224ш	44108	55098	65766			

Б. Выйгрышы ў 1.000 і 5.000 рублёў прыпалі на наступныя нумары сэрый аблігацый бяспроцентна-выйгрышнага выпуску:

№№ сэрый	№№ аблігацыі	сума выйгрыша ў руб.	№№ сэрый	№№ аблігацыі	сума выйгрыша ў руб.
01421	10	1.000	44150	09	1.000
02291	01	1.000	51337	01	1.000
04099	07	1.000	54727	02	1.000
07865	01	1.000	59628	07	1.000
11163	08	1.000	62180	05	5.000
16732	06	1.000	62722	10	1.000
16998	09	1.000	79218	08	1.000
20094	07	1.000	90401	07	1.000
21712	07	1.000	94015	03	1.000
25868	03	1.000	95329ш	02	5.000
39468	01	1.000	95592	06	1.000
41421т	02	5.000			

А. Выйгрышы па 200 рублёў прыпалі на аблігацыі процантна-выйгрышнага выпуску наступных сэрый:

№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый	№№ сэрый
00322	14265	26525	37903	51740	61997	68210	79574	90627
00636	14567	27350	38313	52606	62184	68448	80149	91051
00870	14770	27585	38931	53260	62195	68816	80237	91723
01153	14812	27674